WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

4 ЛІСТАПАДА 2010 г. ЧАЦВЕР
№ 216 (26824)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Прамая лінія

## ЯК ДАПАМАГЧЫ ХВОРЫМ СУСТАВАМ?

Захворванні суставаў сёння настолькі распаўсюджаныя, што іх можна лічыць адной з прыкмет часу. Сярод іх ролю лідара займае астэапароз. Ад чаго ён узнікае? Якія сімптомы гэтага захворвання? Як яго лячыць і ў чым заключаецца прафілактыка хваробы?

Пра гэта мы пагаворым на чарговай «прамой лініі». У ёй возьме ўдзел кіраўнік Рэспубліканскага цэнтра метабалічных астэапатый і астэапарозу, дацэнт, кандыдат медыцынскіх навук Ала Пятроўна Шапялькевіч.

**«Прамая лінія» адбудзецца 5 лістапада ў пятніцу з 15.00 да 16.00 па нумарах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: 8 (017) 287 18 29 і 287 18 36.**

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «ТРАГЕДЫЯ НА «ПІНСКДРЭЎ-ДСП» — АГУЛЬНАЯ БЯДА І СУР'ЁЗНЫ ЎРОК НА БУДУЧАЕ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні родным і блізкім работнікаў СТАА «Пінскдрэў-ДСП», якія загінулі і памерлі ў выніку аварыі на прадпрыемстве.**

«Трагедыя, якая забрала жыцці блізкіх вам людзей, узрушыла ўсіх грамадзян Беларусі. Гэта не толькі ваша асабістае гора, а наша агульная бяда і сур'ёзны ўрок на будучае, — гаворыцца ў спачуванні. — У гэту сумную гадзіну будзьце мужнымі і не падайце духам. Вы і ўсе, хто пацярпеў у тым страшным пажары, заўсёды можаце разлічваць на падтрымку дзяржавы. Мы прыкладзём максімальныя намаганні, каб больш не дапусціць такога ў нашай краіне. Сілы і вытрымкі вам. Светлая памяць аб вашых родных назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах».

## Пытанне ўкаранення ў Мінску сярэдняй штомесячнай квартплаты не знятае з парадку дня

**Пра гэта паведаміў начальнік аддзела энергетыкі Мінгарвыканкама Анатоль Лаўнічук учора на прэс-канферэнцыі ў мэрыі, адказваючы на пытанне карэспандэнта БЕЛТА.**

Гаворка, у прыватнасці, ідзе пра ўвядзенне ў сталіцы сярэдняй штомесячнай платы за ацяпленне ў жылфондзе. Цяпер насельніцтва Мінска плаціць за фактычнае аказанне паслуг: летам менш, зімой больш на велічыню кошту ацяплення. Прапаноўваецца агульную суму за ацяпляльны перыяд падзяліць на ўвесь год — штомесячна давядзецца плаціць аднолькавую суму. «З мая па кастрычнік — у міжацяпляльны перыяд — ішло б назапашванне сродкаў, а з кастрычніка па красавік — у ацяпляльны перыяд — яны б расходаваліся. Па такім шляху пайшлі Масква, еўрапейскія краіны (Польшча, Германія і іншыя). Мы тут не вынайшлі веласіпед, а вывучылі вопыт калег», — адзначыў Анатоль Лаўнічук. Паводле яго слоў, Мінгарвыканкам накіраваў прапанову ў Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, але пакуль падтрымкі не атрымаў. Пры гэтым кіраўнік аддзела энергетыкі ўдакладніў, што гарадскія ўлады прасілі ўкараніць новую для насельніцтва сістэму ў парадку эксперыменту — на некалькіх дамах.

«Лічу, што ў цэлым гэта ідэя мае права на жыццё. Ёй трэба займацца. Ды і для насельніцтва такая сістэма (увядзенне сярэдняй штомесячнай квартплаты. — **Заўв. БЕЛТА**) была б празрыстай», — падкрэсліў начальнік аддзела энергетыкі Мінгарвыканкама. Паводле яго слоў, у жыроўках усе звесткі пра аплату за ацяпленне адлюстроўваліся б: колькі жыхар пераплаціў летам і колькі недаплаціў зімой у сувязі з увядзеннем сярэдняй платы.

**Аксана ШЫКУЦЬ, БЕЛТА.**

## Не толькі аб поспехах, але і аб праблемах

**казалі ў Гродне падчас вылучэння і выбрання ўдзельнікаў чацвёртага Усебеларускага народнага сходу. Горад над Нёманам на гэтым форуме будуць прадстаўляць 98 чалавек.**

Старшыня Гродзенскага гарвыканкама Барыс Казялкоў зазначыў, што развіццё горада за апошнюю пяцігодку вызначалася ўстойлівым, пастyпальным характарам. Не проста павялічваюцца аб'ёмы прамысловай прадукцыі, а вырабляецца менавіта тое, што запатрабавана і на ўнутраным, і на замежных рынках. Пры гэтым актывізуецца інвестыцыйная дзейнасць, многія прадпрыемствы тэхнічна пераўзброіліся, за пяцігодку створана 36,5 тысячы новых рабочых месцаў. Гродна — лідар у рэспубліцы па будаўніцтве жылля, за пяць гадоў каля 12 тысяч сем'яў атрымалі новыя кватэры. Паляпшаецца і транспартная інфраструктура, да канца года завершыцца абнаўленне грамадскага транспарту — на лінію выйдуць 49 новых тралейбусаў і 36 аўтобусаў.

Разам з тым, у горадзе бачаць і праблемы, якія існуюць. Адна з галоўных задач — вывесці шэраг прадпрыемстваў на бясстратную працу. Вялікай увагі патрабуюць і 25 увайшоўшых у склад абласнога цэнтра населеных пунктаў, якія раней належалі да Гродзенскага раёна. У прыватнасці, сказаў Барыс Казялкоў, там трэба паклапаціцца пра забеспячэнне мясцовых жыхароў чыстай пітной вадой.

Таму, хто будзе выступаць на форуме, лічыць адзін з яго ўдзельнікаў, дырэктар інстытута «Гроднаграмадзянпраект» Уладзімір Дзяшко, трэба вельмі прафесійна падрыхтавацца, каб умела і даходліва раскрыць існуючыя праблемы і прапанаваць эфектыўныя шляхі іх вырашэння.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## «ЛістаАДпад!»

**55-гадовая Арнэла Муці, зорка фільма «Утаймаванне сваволька» і славуты сербскі рэжысёр Эмір Кустурыца пройдуць па чырвоным дыванку ў Мінску!**

**У пятніцу адбудзецца ўрачыстае адкрыццё XVII ММКФ «Лістапад», які працягнецца ў Мінску і абласных цэнтрах краіны да 12 лістапада.**

Упершыню атрыбутам айчыннага кінафоруму стане чырвоны дыванок, па якім перад пачаткам цырымоніі ў Палацы Рэспублікі пройдуць славутасці айчыннай і замежных кінематаграфій: Уладзімір Янкоўскі, Аляксандр Яфрэмаў, Валерыя Арланава, Арнэла Муці, Вахтанг Кікабідзэ, Нані Брэгвадзэ, Эмір Кустурыца, Людміла Гурчанка і многія іншыя.

Новым старшынёй кінафестывалю стане заслужаны артыст Беларусі Генадзь Давыдзька. Расціслаў Янкоўскі, адзін з заснавальнікаў кінафорума і нязменны яго старшыня на працягу 16 гадоў, цяпер будзе сустаршынёй Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад».

Квіткі на цырымоніі адкрыцця і закрыцця галоўнага кінамерапрыемства краіны каштуюць ад 20 да 40 тысяч бел. руб. Квіткі на сеансы конкурсных і пазаконкурсных паказаў абяцаюць быць не даражэйшымі за 10 тысяч. Сярод найбольш інтрыгуючых фільмаў: «Шчасце маё» Сяргея Лозніцы (Украіна) пра жыццё глыбінкі і дарогі, якія нікуды не вядуць; «Незалежнасць» Раі Марціна (Філіпіны) — фільм са шматзначнай назвай і неабыякавым для Беларусі зместам; «Я забіў сваю маці» Ксаўе Далана (Канада), якому крыху больш за 20 гадоў, але ягоныя два фільмы ўжо грымяць на ўвесь свет; дэбют Людмілы Гурчанкі ў якасці рэжысёра — фільм «Стракатае змярканне». На адкрыцці кінафорума прадэманструюць сумесны расійска-беларускі кінапраект «Брэсцкая крэпасць».

Інтэрнэт-трансляцыі ўрачыстых цырымоній «Лістапада» ў першы раз можна будзе паглядзець он-лайн на сайце «Белтэлекама» — галоўнага спонсара фестывалю. Акрамя гэтага для зручнасці аматараў незвычайнага кіно аператар сувязі наладзіў адмысловую паслугу: па нумарах 191 і 193 вы высветліце падрабязную інфармацыю пра час, месца і кошт кінапаказаў «Лістапада».

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.11.2010 г. (для б/н разлікаў) | | | |
|---|---|---|---|
| ▲1 долар ЗША | 3 020,00 | 1 чэшская крона | 172,76 |
| ▲1 еўра | 4 239,48 | 1 польскі злоты | 1076,15 |
| 1 латвійскі лат | 5 971,33 | ▲1 расійскі рубель | 98,14 |
| 1 літоўскі літ | 1 227,42 | 1 украінская грыўня | 379,40 |

| Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ | |
|---|---|
| USD | 30,7709 |
| 10 UAH | 38,6569 |
| 1000 BYR | 10,2059 |
| EUR | 43,1654 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

# СЛАБЫЯ ПАЛАВІНКІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Сёстры Таццяна (злева) і Вольга НІКІЦЕНКІ мараць стаць не менш як алімпійскімі чэмпіёнкамі і пераможцамі еўрапейскіх і сусветных спаборніцтваў. А пакуль яны — выхаванкі Магілёўскага вучылішча алімпійскага рэзерву, кандыдаты ў майстры спорту. Від, абраны імі, яшчэ нядаўна лічыўся нежаночым. У Хойніках, адкуль сёстры родам, іх заўважыў першы трэнер і вызначыў, што дзяўчынкі здольныя займацца цяжкай атлетыкай, прывёў у гарадскую дзіцяча-юнацкую школу. Дарэчы, у Хойніках цяпер каля дзесяці дзяўчынак спрабуюць сябе ў цяжкай атлетыцы. Ці не па прыкладзе сясцёр Нікіценак? Калі Таццяна і Вольга прыязджаюць дадому на канікулы, заўсёды наведваюць залу сваёй першай спартыўнай установы і працягваюць там штодзённыя трэніроўкі. На адной з іх маладых цяжкаатлетак — будучых чэмпіёнак — і ўбачыў фотакарэспандэнт «Звязды».**

### Лідары па зарплатах — банкіры і страхаўшчыкі

Сярэдняя зарплата за студзень—верасень у Савецкім раёне Мінска па галінах размеркавалася наступным чынам: банкаўская дзейнасць і страхаванне — 2 млн 395 тыс. рублёў; транспарт — 1 млн 94838 тыс.; навука — 1 млн 958,8 тыс.; будаўніцтва — 1 млн 593,5 тыс.; сувязь — 1 млн 679,3 тыс.; гандаль і грамадскае харчаванне — 1 млн 463,1 тыс.; прамысловасць — 1 млн 408,2 тыс.; ахова здароўя — 1 млн 165,4 тыс.; культура — 1 млн 029,4 тыс.; адукацыя — 1 млн 090,1 тыс.; жыллёва-камунальная гаспадарка — 980 тыс.

**Любоў ЯГОРАНКАВА,** *«Мінск-Навіны».*

## КІШЭННІКІ КРАДУЦЬ МІЛЬЁНАМІ...

**У бестурботнага пасажыра грамадскага транспарту знікла 5 мільёнаў 800 тысяч рублёў.**

Не пашчасціла мужчыну, які захапіў з сабой вялікую суму грошай на куплю аўтамабіля і ехаў у сталічны мікрараён «Серабранка». Пацярпеламу, які патрапіўся пад руку кішэнніку, куды больш прыйшлося б гараваць, калі б злачынца паспеў спустошыць усе яго схованкі ў верхнім адзенні: з сабой пакупнік прыхапіў 30 мільёнаў рублёў, якія расклаў па розных кішэнях. Злодзей жа забраўся толькі ў адну. Яшчэ адна мінчанка, якая ехала ў тралейбусе, страціла 4 мільёны рублёў.

## ЗЛОДЗЕЙ У КАНАПЕ

**У чужую кватэру ён пранік услед за гаспадыняй, якая забылася замкнуць дзверы.**

Нахабнік завітаў у «госці» да 48-гадовай жанчыны, якую, праўда, не папярэдзіў пра свой візіт. Дзейнічаў жа ён вельмі аператыўна і паспеў праслізнуць у незамкнутае жыллё за мінчанкай у той час, калі яна на кухні выкладвала купленыя ў краме прадукты. Толькі тут шанцаванне зладзюжкі скончылася, бо ён даў маху — гаспадыня пачула нейкі шум. Перапалоханая жанчына адразу ж выклікала міліцыю, супрацоўнікі якой аператыўна з'явіліся на месца здарэння. Адшукалі нязванага візіцёра ў канапе. Менавіта там спадзяваўся схавацца 25-гадовы злачынца.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## БОЛЬШАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ ДАВЯРАЕ ПРЭЗІДЭНТУ І ГАТОВАЯ ПАЙСЦІ НА ВЫБАРЫ

**Насельніцтва Беларусі давярае Прэзідэнту. Такія апошнія звесткі, атрыманыя падчас сацыялагічнага даследавання Інфармацыйна-аналітычным цэнтрам пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узровень народнага даверу перавышае 80 працэнтаў.**

Згодна з інфармацыяй ІАЦ, узровень даверу кіраўніку дзяржавы за перыяд з II квартала 2008 года па II квартал 2010 года практычна не змяніўся — каля 80 працэнтаў. 77,5 працэнта ўдзельнікаў апытання лічаць, што дзейнасць Аляксандра Лукашэнкі на пасадзе Прэзідэнта адпавядае інтарэсам такіх людзей, як яны. Столькі ж грамадзян перакананыя, што Беларусь развіваецца ў правільным накірунку.

Сацыялагічныя даследаванні, праведзеныя на працягу кастрычніка 2010 года, паказалі, што 90 працэнтаў грамадзян маюць намер узяць удзел у прэзідэнцкіх выбарах. Прычым за дзейнага кіраўніка дзяржавы ўжо зараз гатовыя прагаласаваць 66,4 працэнта рэспандэнтаў. Не захацелі назваць ці не вызначыліся са сваімі электаральнымі перавагамі 29,9 працэнта апытаных.

**Ул. інф.**

### ЭЛЕКТАРАЛЬНЫЯ ПЕРАВАГІ РЭСПАНДЭНТАЎ

**Калі б заўтра адбыліся выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, за каго б Вы прагаласавалі?**

(у % ад колькасці апытаных)




### УДЗЕЛ У ВЫБАРАХ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Амаль 90% рэспандэнтаў збіраюцца ўзяць удзел у выбарах.

**19 снежня 2010 г. адбудуцца выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Ці збіраецеся Вы ўзяць у іх удзел?**

(у % ад колькасці апытаных)




### УЗРОВЕНЬ ДАВЕРУ ПРЭЗІДЭНТУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

(у % ад колькасці апытаных)




## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Дзілму Русеф з выбраннем Прэзідэнтам Бразіліі

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў Дзілму Русеф з выбраннем на пасаду Прэзідэнта Федэратыўнай Рэспублікі Бразілія.**

«Упэўнены, што дзякуючы вашай невычэрпнай энергіі і стараннай рабоце на карысць бразільскага народа будуць значна прымножаны дасягненні на шляху палітычнага і эканамічнага развіцця краіны». Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў імкненне Беларусі да поўнамаштабнага дыялога з Бразіліяй, пашырэння міждзяржаўных кантактаў, паглыблення супрацоўніцтва ў сферы эканомікі, навукі, высокіх тэхналогій, культуры.

Прэзідэнт Беларусі накіраваў таксама віншаванне Луісу Інасіу Луле да Сілва ў сувязі з перамогай Дзілмы Русеф, прадстаўніцы Партыі працоўных, у другім туры прэзідэнцкіх выбараў. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў час перагавораў у сакавіку 2010 года былі дасягнуты прынцыповыя дамоўленасці па істотных пытаннях двухбаковых адносін, закладзены трывалы падмурак для іх умацавання і актывізацыі на перспектыву. «Не сумняваюся, што з выбраннем на высокую пасаду вашай прыхільніцы намечаныя сумесныя праекты не толькі будуць прадоўжаны, але і атрымаюць моцны імпульс для ажыццяўлення на карысць грамадзян Беларусі і Бразіліі».

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ЦЯГНІК ДЛЯ БАЛЕЛЬШЧЫКАЎ «БАТЭ»

Для дастаўкі пасажыраў і балельшчыкаў футбольнага клуба «БАТЭ» чыгунка прызначыла электрацягнік Мінск — Барысаў. Адпраўляцца са станцыі Мінск-Пасажырскі ён будзе 4 лістапада ў 23.01, ісці з прыпынкамі: Сцяпянка, Азярышча, Калодзішчы, Гарадзішча, Смалявічы, п.п. Зарэчнае, Ч. Знамя, п.п. Жодзіна-Паўднёвы, Жодзіна, п.п. Печынскі. Прыбудзе на станцыю Барысаў электрацягнік 5 лістапада ў 0.19.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## РАБАВАЛІ ПАД ВЫГЛЯДАМ МІЛІЦЫЯНЕРАЎ

У Мінску крымінальны «дуэт» адбіраў у пацярпелых грошы і мабільнікі. Першаму не пашчасціла, паводле звестак прэс-афіцэра Заводскага РУУС Тамары Рулінскай, 37-гадоваму мужчыну, на якога злачынцы напалі каля апоўначы: каб збіць няшчаснага з панталыку, на яго нават спрабавалі надзець наручнікі. Сваёй ахвяры незнаёмцы адрэкамендаваліся супрацоўнікамі міліцыі, пасля чаго бессаромна пачалі шарсціць па кішэнях. «Ліпавым» праваахоўнікам пашчасціла, бо пацярпелы меў пры сабе вялікую суму грошай. Канфіскаваўшы ў яго 500 долараў ЗША і мабільны тэлефон, злачынцы зніклі. А праз некалькі дзён іх ахвярай стаў 26-гадовы мінчанін, якога гэты крымінальны «дуэт» па аналагічным сцэнарыі абрабаваў на прыпынку «Станцыя метро «Магілёўская». А ў хуткім часе аператыўнікі Заводскага РУУС устанавілі асобы зламыснікаў. Як высветлілася, такім чынам «падпрацоўваў» 27-гадовы работнік аднаго з прадпрыемстваў сталіцы, а дапамагаў яму ў гэтым беспрацоўны. Апошні, між іншым, не ўпершыню выйшаў на «вялікую дарогу», бо меў канфлікты з правасуддзем за рабаўніцтва раней.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## БАТАЛЬЁН «ЗАЧЫШЧАЕ» ДЗЯЛЯНКІ

**...Канкрэтна на гэтыя мясціны, як і на значную частку ўвогуле ўсяго Чэрвеньскага раёна, стыхія абрынулася 8 жніўня. Вецер небывалай сілы ішоў ад Язовак: на Вялікаполле і далей. Шматкілаграмовыя валкі саломы, што застаюцца на полі пасля камбайнаў, ён з лёгкасцю не толькі перакідваў за сотні метраў з іржышча праз дарогу, але і «зашпурнуў» некалькі з іх за дзясяткі метраў — з бліжэйшага палетка пад самыя вокны ў гародчык адной з крайніх хат...**

І дагэтуль пра накірунак урагану красамоўна сведчаць сагнутыя ў адзін бок, знявечаныя дрэвы ў лесе там, дзе да драўніны яшчэ не паспелі дабрацца брыгады лесарубаў, а пра яго моц — «вычасаныя», нібы гіганцкім грэбнем, дзялянкі... Сведкі тады казалі, што гэта было падобна на канец свету. Цяпер у гэты лес перакінуты зводны батальён транспартных войскаў...

СТАР. 3



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Драўніну толькі паспяваюць вывозіць.

ISSN 1990 - 763X

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ПАЙШОЎ З ЖЫЦЦЯ ВІКТАР ЧАРНАМЫРДЗІН



**Адмысловы прадстаўнік прэзідэнта РФ па пытаннях эканамічнага супрацоўніцтва з дзяржавамі — удзельніцамі СНД, былы кіраўнік ўрада РФ, экс-пасол РФ на Украіне Віктар Чарнамырдзін, паводле папярэдніх звестак, памёр ад інфаркту міякарда, паведамілі выданню Life News у Цэнтральнай клінічнай бальніцы Масквы.**

Паводле слоў крыніцы Life News, у ЦКБ Чарнамырдзін рэгулярна праходзіў гемадыяліз — ачышчэнне крыві пры дапамозе адмысловай устаноўкі ў сувязі з вострай нырачнай недастатковасцю, якую выклікала цяжкае анкалагічнае захворванне. Палітыка прывозілі ў лякарню на «хуткай», а пасля працэдуры ён вяртаўся дахаты. Нядаўна Чарнамырдзін быў у цяжкім стане шпіталяваны ў ЦКБ.

Як пацвердзіў ІТАР-ТАСС дараднік Чарнамырдзіна Валянцін Сяргееў, палітык памёр у 3.40 у сераду ў ЦКБ. Раней гучалі і іншыя версіі: дома, за мяжой, дзе знаходзіўся на лячэнні. Віктар Чарнамырдзін будзе пахаваны на Новадзявочых могілках Масквы побач з магілай сваёй жонкі Валянціны Фёдараўны, якая памерла ў сакавіку гэтага года.

***Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні сынам, родным і блізкім Віктара Чарнамырдзіна.***

***«З глыбокім смуткам у Рэспубліцы Беларусь было ўспрынята паведамленне аб смерці вашага бацькі, значнага дзяржаўнага дзеяча Расійскай Федэрацыі Віктара Сцяпанавіча Чарнамырдзіна», — гаворыцца ў спачуванні.***

### МАХМУД АХМАДЗІНЕЖАД: РАСІЯ ПРАДАЛА ІРАН ВОРАГАМ



**Расія прыняла рашэнне пра адмову ад паставак яго краіне зенітна-ракетных комплексаў С-300 пад уплывам ЗША, выказаў здагадку прэзідэнт Ірана Махмуд Ахмадзінежад. Расія «прадала нас нашым ворагам, у аднабаковым парадку адмовіўшыся ад кантракта», — заявіў прэзідэнт у эфіры іранскага дзяржаўнага тэлебачання.**

«Некаторыя пад уплывам сатаны лічаць, што могуць незаконна і ў аднабаковым парадку адмяніць кантракт у сферы абароны і што гэта стане ўдарам для іранскай нацыі», — дадаў прэзідэнт Ірана. Кантракт на пастаўку Ірану комплексаў проціпаветранай абароны С-300 быў падпісаны яшчэ ў канцы 2007 года. Расія павінна была паставіць Ірану пяць дывізіёнаў зенітна-ракетнай сістэмы С-300ПМУ-1 на агульную суму каля 800 мільёнаў долараў. Аднак за тры гады ракеты ў Ісламскую Рэспубліку так і не патрапілі.

### ДАЎЖЫНЯ БЮЛЕТЭНЯ НА ПАРЛАМЕНЦКІХ ВЫБАРАХ У МАЛДОВЕ СКЛАДЗЕ КАЛЯ МЕТРА

**У датэрміновых парламенцкіх выбарах у Малдове 28 лістапада прымуць удзел 20 партый і 20 незалежных кандыдатаў. Учора Цэнтральная выбарчая камісія пасля праверкі ўсіх пададзеных раней дакументаў зарэгістравала апошніх 13 прэтэндэнтаў на ўдзел у выбарах, паведамілі ў ЦВК.**

Паводле ацэнак Цэнтрвыбаркама, даўжыня бюлетэня на выбарах складзе каля 1 м. Паводле дзейснага ў Малдове Кодэкса аб выбарах, выбарчы парог для партый складае 4%, для выбарчых блокаў з дзвюх партый — 7%, для блокаў з трох і больш партый — 9%, для незалежных кандыдатаў — 2%. У парламенце Малдовы працуе 101 дэпутат. Парламент цяперашняга склікання быў распушчаны ў сувязі з тым, што не змог абраць новага прэзідэнта.

# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

4 лістапада 2010 г.
№ 38 (232)


БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

## Ёсць для каго сад саджаць

**— Самая вялікая наша праблема — недахоп месцаў у дзіцячым садку і школе, — гаворыць Анатоль Татарынаў, дырэктар ААТ «Саўгас-камбінат «Сож», намеснік старшыні Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў. — Але ж я ўсім пажадаў бы мець менавіта такія праблемы, — усміхаецца кіраўнік адной з самых буйных гаспадарак на Гомельшчыне. І дадае, што налета ў Новай Гуце пачнецца будаўніцтва гэтых неабходных сацыяльных аб'ектаў.**



Старшыня Гомельскага гарсавета Іван БАРАДЗІНЧЫК, дэпутат Алег ЯДРЫНЦАЎ, старшыня Гомельскага аблсавета Марыя БОНДАР.

Сюды, на самы край вобласці, у аграгарадок Новая Гута, які непасрэдна мяжуе з Украінай, прыехалі дэпутаты Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў, каб пацікавіцца вырашэннем праблем сельскіх жыхароў і тым, як забяспечваецца для іх належны ўзровень жыцця — не горш, чым у горадзе. Дарэчы, саўгас-камбінат «Сож» уваходзіць у тройку сельгаспрадпрыемстваў, якія вырабляюць самую вялікую ў рэспубліцы колькасць свініны. Анатоль Аляксеевіч, які 14 год кіруе камбінатам, не лічыць, што поспехі — сакрэтная інфармацыя:

— У нас сярэдні ўзрост тых, хто працуе, — 34 гады. Штогод будуем 100-120 кватэр. Цяпер пад дахам «Сожа» аб'яднаныя сем былых гаспадарак. Узялі пад апеку вёскі, якія раней лічыліся бесперспектыўнымі: Краўцоўку і Церуху. І тут таксама пачалі актыўна будавацца, вось народ і застаецца працаваць на вёсцы. Акрамя таго, і дарослым жыхарам, і іх дзецям ёсць чым заняцца. У нас тут Дом культуры, школа мастацтваў, спарткомплекс з басейнам, школа алімпійскага рэзерву. Так што ўсе магчымасці для самарэалізацыі створаныя — хоць і не вельмі блізка ад абласнога цэнтра знаходзімся. Ну і заробак адпаведна, стабільны — а як інакш людзей зацікавіць?

На што звяртае асаблівую ўвагу Анатоль Татарынаў — гэта добраўпарадкаванне пасёлка і навакольных вёсак. Яно ажыццяўляецца ў тым ліку сіламі супрацоўнікаў сельскагаспадарчага прадпрыемства і самімі жыхарамі: частка дамоў знаходзіцца на балансе камбіната. Да добраўпарадкавання, якое прынясе вынік праз тры гады — у выглядзе ўраджаю яблыкаў — вырашылі далучыцца і дэпутаты абласнога Савета. Пераапрануліся ў гумавыя боты і пайшлі саджаць сад. За тэхналогіяй пільна сачылі спецыялісты, бо тут трэба не проста невялічкія дрэўцы ў зямлю паўторкваць, а выканаць усе правілы — каб дабрачынная акцыя прынесла сапраўдны плён.

— Яблыні, якія мы пасадзілі, будуць радаваць людзей і кветкамі, і пладамі шмат год, — адзначае старшыня абласнога Савета дэпутатаў Марыя Бондар. — Наша дэпутацкая акцыя «За моцную і квітнеючую Беларусь» прадугледжвае ўдзел не толькі дэпутатаў абласнога ўзроўню, але і раённага, і сельскага. Акрамя таго, мы запрасілі да ўдзелу ў ёй і членаў БРСМ, і членаў грамадскага аб'яднання «Белая Русь» — па ўсёй вобласці. Тым больш, што сёння паўсюль ёсць зямля, якую могуць упрыгожыць рукі людзей.

Дэпутаты Гомельскага абласнога Савета пасадзілі 200 маладых яблыняў гатунку «Глостэр» на плошчы ў 1,3 га. У хуткім часе ў ім будзе расці каля 800 пладовых дрэўцаў — пасадзяць іх дэпутаты сельскіх Саветаў і мясцовая моладзь.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.**

*Гомельскі раён.*

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

## ЛЯЧЭБНЫ ЭФЕКТ

**Да вырашэння праблем выбаршчыкаў дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Іна АНТОНАВА падыходзіць як вопытны доктар**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**«Не думаць пра кепскае!» — так настройвае навакольчан, якія звяртаюцца да яе са здавалася б невырашальнай праблемай, дэпутат Іна АНТОНАВА. Проста таму што верыць: безвыхадных сітуацый не бывае. І гэтая вера дапамагае народнай абранніцы... дапамагаць людзям. На службе ў Іны Антонавай — яшчэ некалькі ключавых прынцыпаў, якія фарміруюць яе цалкам жыццяздольнае дэпутацкае крэда.**

### Успрымальнасць

— Дэпутат — гэта праваднік паміж народам і ўладай, — перакананая народная абранніца, дэпутацкі стаж якой перасягнуў ужо два дзесяцігоддзі. Яна паспела папрацаваць у Саветах розных узроўняў і ведае, што турбуе землякоў, не па аповедах. — Мы выйшлі з народа і працуем для яго. Таму павінны вельмі чуйна ўлавіць той боль, тыя праблемы, якія ёсць, і абавязкова іх вырашыць.

Чуйнасці жанчыне-урачу не займаць: яна даўно прызвычаілася лячыць не толькі фізічныя хваробы людзей, апісаныя ў медыцынскіх даведніках, але і душэўныя.

— Не люблю азначэння «межы кампетэнцыі» ў дачыненні да дэпутата, — прызнаецца спадарыня Антонава. — Няхай па сутнасці чалавеку і трэба было звярнуцца ў выканкам, службу ЖКГ ці якую іншую ўстанову. Але ж ён прыйшоў са сваёй праблемай да цябе, не да кагосьці іншага — аказаў давер. І дэпутат павінен дапамагаць, а не перадаваць яе ўніз па інстанцыях.

Не прызнае яна і часавых абмежаванняў у працы — спалучэнне «працоўны адпачынак» нярэдка ператвараецца ў кур'ёзную гульню слоў, калі працаваць даводзіцца і на адпачынку. Сказаць, што дэпутат знаходзіцца ў пастаянным кантакце з людзьмі, не будзе перабольшаннем:

— Нашы стасункі не абмяжоўваюцца прыёмамі. Мы заўжды на сувязі. І што самае прыемнае, тэлефануюць не толькі тады, калі здарылася дрэннае, але і каб падзяліцца радасцю. Значыць, давяраюць!.. — з задавальненнем кажа суразмоўца.

### Дасведчанасць

Мала аднаго толькі ўспрыняцця праблем у акрузе. Патрэбна яшчэ кампетэнтнасць.

— Калі праблемнае пытанне правільна вывучанае і правільна пададзена, тады лічы — перамога, — упэўнена суразмоўца. — Але для гэтага трэба вучыцца.

Аналіз працы ў акрузе паказаў, што самае слушнае — паглыбляць свае веды па некалькіх самых праблемных кірунках.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

## НЕ ВЫКІДВАЦЬ ТОЕ, ШТО ХОЧАЦЦА, ТАМ, ДЗЕ ХОЧАЦЦА



**Папярнянскі сельсавет Мінскага раёна ўжо даўно жыве без датацый. На пачатак года даходная частка бюджэту сельвыканкама планавалася ў памеры крыху больш за 600 мільёнаў рублёў (асноўныя крыніцы паступленняў — падатак на зямлю і падатак на нерухомасць). Даходы ад зямельных аўкцыёнаў, натуральна, тут не ўлічваліся. За перыяд з лютага па кастрычнік на тэрыторыі сельсавета было рэалізавана 17 участкаў на суму звыш 1 мільярда рублёў. Бюджэт прыйшлося ўдакладніць, і на сённяшні яго даходная частка складае без малога 2 мільярды рублёў.**

Над тым, на што расходаваць мэтавыя «аўкцыённыя» грошы, старшыні сельвыканкама Яўгену САВЕЛЬЕВУ доўга ламаць галаву не прыйшлося.

Звыш 1,4 мільярда рублёў, атрыманых ад продажу зямлі на працягу года, былі затрачаны на добраўпарадкаванне аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры: рамонт будынкаў і ўпарадкаванне дваровых тэрыторый школ, дзіцячых садкоў, сельскіх клубаў, на правядзенне ў належны стан амбулаторый. Акрамя таго, грошы былі патрачаны на рамонт і добраўпарадкаванне грамадскага пункта аховы правапарадку. Найбольшая колькасць сродкаў сельвыканкама (звыш 540 млн рублёў) сёлета пайшла на асфальтаванне вуліц у аграгарадку Бальшавік.



На прыёме ў старшыні сельскага Савета Яўгена САВЕЛЬЕВА (справа).

Нагадаем, што рашэннем Мінаблвыканкама, прынятым у лютым 2010 года, дарогі сельскіх населеных пунктаў былі перададзены на баланс ДРБУ. Аднак на той момант бюджэт абласных дарожнікаў ужо быў сфарміраваны і, натуральна, расходы на перададзеныя дарогі там не прадугледжваліся.

— У сувязі з тым, што пасля перадачы сельскіх дарог мы больш не мелі права накіроўваць свае сродкі на іх утрыманне, на сесіі нашага сельскага Савета было прынята рашэнне (якое потым зацвердзіў Мінрайсавет) аб накіраванні сродкаў сельвыканкама на асфальтаванне дарог аграгарадка Бальшавік. Мы пералічылі грошы ў Мінскі райвыканкам, а ўпраўленне капітальнага будаўніцтва заключала дагавор з дарожнай арганізацыяй, якая і расходавала гэтыя сродкі на ўкладку асфальта-бетоннага пакрыцця. Безумоўна, гэта больш доўгі шлях, чым фінансаванне работ напрамую, затое па факце пытанне было вырашана.

Сёлета менавіта на ўпарадкаванне дарог і замену дарожнага пакрыцця мы накіравалі сродкаў значна больш, чым у папярэднія гады, аднак, на жаль, з гэтага зусім не вынікае, што ўсе дарогі сельсавета знаходзяцца на належным узроўні. Хацелася б добраўпарадкаваць усе вуліцы ва ўсіх нашых населеных пунктах. Найбольш складаная сітуацыя са станам дарог застаецца ў Сёмкаве. Будучы аграгарадок месціцца на ўзгорыстай тэрыторыі, нязручнай для кампактнага размяшчэння домаўладанняў і работы дарожных служб, аднак да канца года менавіта на дарогі тут будзе затрачана 140 млн рублёў.

Ёсць пытанні і па раёнах «новай» забудовы. Жылыя будынкі там былі ўзведзеныя ў 90-х гадах, а дарогі — пясчана-гравійныя і грунтовыя — яшчэ і сёння далёкі ад дасканаласці. Некаторыя мясцовыя жыхары выходзяць з сітуацыі самастойна: напрыклад, вуліцы Сонечная і Светлая ў Сёмкаве летась выступілі з ініцыятывай аплаціць за ўласныя грошы будматэрыялы, неабходныя для ўпарадкавання праезнай часткі. КУП «Кажухова» прывёз пясчана-гравійныя сумесі, набытыя за сродкі грамадзян, і зрабіў падсыпку.

— Прыкладаюцца ўсе намаганні для ўтрымання вуліц населеных пунктаў у здавальняючым стане, — патлумачыў Яўген Аляксандравіч, — але магчымасці сельскага выканкама і КУПа абмежаваныя. У прыватнасці, у нас няма спецыялізаванай дарожнай тэхнікі, таму падкрэсліў, што рашэнне аблвыканкама аб перадачы дарог на баланс спецыялізаванай было правільным.

Паводле слоў старшыні сельскага Савета, калі Мінскі раён афіцыйна набудзе статус прысталічнага рэгіёна, значна больш працэнт падаткаў, якія збіраюцца на яго тэрыторыі, будзе заставацца ў раённым бюджэце. Менавіта з такой прапановай выступіў дэпутат Папярнянскага сельскага і Мінскага раённага Саветаў дэпутатаў, генеральны дырэктар ТАА «Белінтэртранс» Вячаслаў Доўнар на сустрэчы старшыні Мінаблвыканкама Барыса Батуры з суб'ектамі гаспадарання. Прааналізаваўшы прапанову дэпутата, Барыс Батура даў даручэнне старшыням райгарвыканкамаў разгледзець і ўлічыць прапановы Вячаслава Доўнара пры фарміраванні бюджэту на наступны год. Калі доля падаткаў, якія пакідаюцца ў бюджэце Мінскага раёна, павялічыцца, тады больш аб'ём грашовых сродкаў можна будзе расходаваць на ўпарадкаванне дарог.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ТЭМА ДНЯ

## ЭКЗАМЕН ДЛЯ МЯСЦОВАЙ УЛАДЫ

### «Спецыфічная» тэрыторыя і яе патэнцыял

**На базе адразу двух раёнаў — Касцюковіцкага і Краснапольскага — адбылося чарговае пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі.**

Рэгіён для наведвання быў выбраны не самы просты: 34 працэнты тэрыторыі Касцюковіцкага раёна і 46 працэнтаў Краснапольскага знаходзяцца ў зоне радыяцыйнага забруджвання, і пытанні жыццезабеспячэння насельніцтва вырашаюцца тут паралельна з праблемамі ліквідацыі наступстваў Чарнобыльскай аварыі.

— Таму мы і хацелі прыцягнуць увагу менавіта да гэтых раёнаў, — сказаў, адкрываючы пасяджэнне, **Старшыня Савета Рэспублікі, старшыня Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання Анатоль РУБІНА**Ў. — І, разам з тым, паглядзець, як узаемадзейнічаюць мясцовыя органы ўлады, суб'екты гаспадарання і іншыя арганізацыі, забяспечваючы больш камфортныя ўмовы для жыцця, працы і адпачынку грамадзян.

Знаёмства з тэрыторыяй пачалося з Касцюковіцкага спіртзавода Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Клімавіцкі лікёра-гарэлачны завод». І не трэба шукаць у выбары гэтага «адпраўнога пункта» нейкі падтэкст. У выніку частковай мадэрнізацыі і замены ўстарэлага абсталявання прадпрыемства выйшла на 23 працэнты рэнтабельнасці. Цяпер тут вырабляюць высакаякасны этылавы спірт (96,3°), які выкарыстоўваецца для вытворчасці алкагольных напояў. З цягам часу, пасля завяршэння рэканструкцыі, гэта будзе адзінае прадпрыемства такога кшталту на тэрыторыі не толькі постсавецкай прасторы, але і Заходняй Еўропы. І калі раней прадпрыемства імкнулася прабіцца на расійскі рынак, то сёння перавага аддаецца заходняму: заказаў з Еўропы паступае столькі, што іх ледзь паспяваюць задавальняць.

Поўная мадэрнізацыя Касцюковіцкага спіртзавода «пацягне» на 25 млрд рублёў. Лічба значная, але затраты абяцаюць акупіцца. І каб працэс не зацягваўся, да фінансавання, акрамя Белдзяржхарчпрама, падключыўся і Магілёўскі аблвыканкам.

— Запусцім, скінуўшыся, спачатку трэцюю чаргу, і такім жа чынам апошнюю, чацвёртую, — патлумачыў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр РУДНІК**. — Хоць прадпрыемства гэта рэспубліканскае, але ж знаходзіцца яно на тэрыторыі Магілёўскай вобласці і з'яўляецца ў нас падаткаплацельшчыкам «нумар адзін». Таму не дапамагчы мы не можам.

На буйным горадаўтваральным прадпрыемстве «Беларускі цэментны завод» сярэдняя зарплата за верасень склала 1 540 тыс. рублёў, а да канца года дасягне 1 900 тыс. рублёў, што для аддаленага райцэнтра зусім не дрэнна (нават у сталіцы такімі заробкамі можа пахваліцца далёка не кожны). 2009 год, крызісны па вызначэнні, для прадпрыемства быў паспяховым. Рэальная рэнтабельнасць амаль у два разы «перакрыла» запланаваную, прыбытак вылічваўся мільярдамі рублёў... «Сакрэт» поспеху — усё ў той жа мадэрнізацыі, а таксама ў зніжэнні энергаёмістасці прадукцыі. Упершыню ў цэментнай прамысловасці тут былі ўведзеныя ў эксплуатацыю дзве ўстаноўкі, якія цалкам забяспечылі прадпрыемства ўласнай электраэнергіяй. Укараненне найноўшых тэхналогій дазволіла павялічваць аб'ёмы прадукцыі, не раздзімаючы штат. А калі на тых жа вытворчых плошчах і з той жа штатнай колькасцю выпускаецца больш прадукцыі, то аўтаматычна павялічваецца заработная плата, узмацняецца сацыяльная абарона людзей.

«Сацыяльны пакет» завадчан уключае ў сябе дадатковыя сродкі на аздараўленне, лячэнне, набыццё лекаў, навучанне і адпачынак, будаўніцтва жылля, выплату 13-й зарплаты і г.д. Пяць гадоў таму да цэментнага завода далучылі сельскагаспадарчае прадпрыемства-аўтсайдар «Ленінскі шлях», страты якога на той момант складалі 20 мільёнаў рублёў. Яго рэарганізавалі ў аграрнае падраздзяленне «Цэмагра», якое сёння прыносіць прыбытак і не мае дэфіцыту працоўных рук. Сярэдняя заработная плата на «Цэмагра» — 1 200 тыс. рублёў.

Комплекснае сацыяльна-эканамічнае ўладкоўванне сельскіх тэрыторый, паляпшэнне ўмоў жыцця мясцовых жыхароў па-ранейшаму застаецца адной з галоўных дзяржаўных задач, пра што неаднойчы ішла гаворка падчас выязнога пасяджэння. Напрыклад, тэрыторыя Беладубраўскага сельсавета Касцюковіцкага раёна лічыцца «спецыфічнай» — з-за таго, што ў свой час пацярпела ад радыяцыйнага забруджвання. Сёння ў сельсавеце жыве крыху больш за тысячу чалавек, ёсць вёскі, дзе ўвогуле засталося па некалькі жыхароў. Але медыцынскім і транспартным абслугоўваннем ахопленыя ўсе без выключэння населеныя пункты. На ФАПе (іх у сельсавеце тры) чалавек можа заказаць і набыць усе патрэбныя лекі. У любы час з самай далёкай вёсачкі можна патэлефанаваць і выклікаць «на дом» медсястру. Аўтакрамы прыходзяць строга ў адпаведнасці з графікам (два разы на тыдзень) і таксама працуюць на заказ. Уласным падсобным гаспадаркам дапамагае СВК — і ў апрацоўцы глебы, і ва ўборцы збожжавых, і ў дастаўцы саломы і сена. У малакольксных населеных пунктах гэтыя паслугі аказвае мясцовы камбінат бытавога абслугоўвання (КБА).

У адпаведнасці з Указам № 21, грамадскія калодзежы, якія знаходзяцца на тэрыторыі сельсавета, нарэшце, пачалі перадаваць на баланс спецыялізаванай арганізацыі (жылкамунгаса). А вось вуліцы сельскіх населеных пунктаў усё яшчэ застаюцца ў «падвешаным стане» і пакуль што не належаць нікому.

— Чаму вы не перадаяце іх ЖКГ? Што перашкаджае? — пацікавіўся губернатар. — Адпаведнае рашэнне ў вобласці прынятае, і яго трэба выконваць!

Аказалася, каб перадаць вуліцы, сельсавету спачатку неабходна афарміць адпаведную дакументацыю. Гэта патрабуе фінансавых затрат, і не маленькіх, а яны ў бюджэт сельсавета не закладзеныя.

Анатоль Рубінаў прапанаваў райвыканкаму ўзяць вырашэнне пытання на сябе і вынайсці сродкі на афармленне праваўстаноўчых дакументаў для гэтых аб'ектаў.

— Сельвыканкамы нічога не павінны плаціць. Мэтазгодна, каб за афармленне дакументацыі плацілі будучыя гаспадары — тыя, хто прымае вуліцы на свой баланс. Адпаведныя сродкі павінны быць закладзеныя ў раённы бюджэт на наступны год, гэтага неабходна дабівацца, — падкрэсліў ён. — Разам з тым, перадаўшы на раённы ўзровень адказнасць за ўтрыманне тых ці іншых аб'ектаў, мы не павінны пазбавіць сельскую ўладу плацежаздольнасці. Яна не можа ўвесь час хадзіць з «працягнутай рукой» і прасіць.

У адпаведнасці з заканадаўствам, з наступнага года ў бюджэце сельсаветаў будзе заставацца падаходны падатак з фізічных асобаў. Напрошваецца заканамерны вывад: сельская ўлада павінна быць зацікаўленая ў развіцці малога прадпрымальніцтва. Дзе яно — там новыя працоўныя месцы і, адпаведна, падаткі ў мясцовы (сельскі!) бюджэт.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)


## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| ЛОТ 1 | |
| 1. Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-9626 | Здание административно-хозяйственное (дворец), 1885 г.п., 2-этажное, фундамент бутобетонный, стены кирпичные толщ. 0,92 м, перегородки кирпичные, кровля – жесть, общая площадь 1254,8 м.кв., составные части и принадлежности: две террасы, две кирпичные холодные пристройки, кирпичный мезонин, подвал. Памятник историко-культурного наследия 3 категории, стиль – поздний классицизм |
| Местонахождение объекта | Гродненская обл., Ивьевский район, Субботникский с/с, д. Жемыславль, ул. Садовая, д. 1А |
| Земельный участок | Земельный участок с кадастровым номером 422984306601000114 площадью 0,2499 га, назначение – земельный участок для обслуживания административного здания |
| 2. Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-9625 | Здание многоквартирного жилого дома, 1905 г.п., 2-этажное, фундамент бутобетонный, стены кирпичные толщиной 0,82 м, перегородки кирпичные, кровля – асбестоцементные листы по деревянным стропилам, общая площадь 365,7 м.кв., жилая площадь 210,7 м.кв. Памятник историко-культурного наследия |
| Местонахождение объекта | Гродненская обл., Ивьевский район, Субботникский с/с, д. Жемыславль, ул. Садовая, д. 1Б |
| Земельный участок | Земельный участок с кадастровым номером 422984306601000115 площадью 0,0651 га, назначение – земельный участок для обслуживания жилого дома |
| 3. Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-9623 | Здание строительного склада, 1908 г.п., 1-этажное, фундамент бутобетонный, стены бревенчатые толщ. 0,18 м, перегороди бревенчатые, кровля – асбестоцементные листы по деревянным стропилам, общая площадь 334,6 м.кв. Памятник историко-культурного наследия |
| Местонахождение объекта | Гродненская обл., Ивьевский район, Субботникский с/с, д. Жемыславль, ул. Заводская |
| Земельный участок | Земельный участок с кадастровым номером 422984306601000076 площадью 0,0536 га, назначение – земельный участок для обслуживания здания строительного склада. Памятник историко-культурного наследния |
| Начальная цена продажи | 1 014 601 920 белорусских рублей с учетом НДС. |
| Сумма задатка | 50 730 096 белорусских рублей с учетом НДС. |
| Продавец | Сельскохозяйственный производственный кооператив «Субботники», 231341, Гродненская область, Ивьевский район, д. Субботники |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41 98 32, 41 98 34 |
| Условия аукциона | 1) Обеспечение сохранности историко-культурной ценности и в течение одного месяца с момента перехода права собственности на вышеуказанные объекты историко-культурной ценности подписать охранное обязательство, составленное по форме, установленной Министерством культуры Республики Беларусь. 2) Проведение реставрационно-восстановительных работ вышеуказанных объектов недвижимости историко-культурной ценности и вовлечение их в хозяйственный оборот в течение 5 лет с момента заключения договора купли-продажи. 3) Создание новых рабочих мест. 4) Возмещение затрат сельскохозяйственному производственному кооперативу «Субботники» по проведению оценки рыночной стоимости вышеуказанных объектов недвижимости историко-культурной ценности на сумму 5 145 955 рублей |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с 3012286350011, отделение № 201 г. Гродно ГФ по Гродненской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 152101705, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 7 декабря 2010 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209**

К участию в аукционе допускаются негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30**

**Последний день приема заявлений 6 декабря 2010 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 41 98 32, 41 98 34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

# Лячэбны эфект

**(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

— Адпрацаваўшы столькі гадоў дэпутатам, магу беспамылкова сцвярджаць, з чым часцей за ўсё прыходзяць людзі. Пытанні ЖКГ — 50 працэнтаў, пытанні медыцыны — 30 працэнтаў, судовыя пытанні — 10 працэнтаў.

А значыць, дэпутату варта найперш самому быць падкаваным у гэтых кірунках, і пра адпаведныя заканадаўчыя змены інфармаваць выбаршчыкаў у першую чаргу.

— Парламент зараз рыхтуе да першага чытання праект Жыллёвага кодэкса. У нашай Наваполацкай акрузе мы вельмі актыўна яго абмяркоўваем. Праблемы ЖКГ у нас заўжды першыя на парадку дня. Свежы прыклад: наступіў ацяпляльны сезон, змяніліся сумы ў жыроўках — а суседзі ж заўжды іх параўноўваюць. І пачалося: чаму ён заплаціў менш, а ў яго цяплей... Высветлілася, што некаторыя жыхары робяць сабе падлогу з падагрэвам і «забываюцца» інфармаваць пра гэта службу ЖКГ, а гэта з'яўляецца парушэннем. Па сутнасці, з такім дадатковым ацяпленнем яны адбіраюць цяпло ў сваіх суседзяў. Хочаце цёплую падлогу — на здароўе, толькі чаму за кошт іншых?!

Дэпутат таксама лічыць важным знаёміць людзей з падрабязнымі выкладкамі па «камуналцы»:

— Заўважыла, як афармляюцца ў Мінску жыроўкі — з рэкламай на адваротным баку. Падумала, а чаму б нам падрабязна не распісаць тарыфы на адвароце? Тады не ўзнікне пытанняў, куды ідуць грошы. Многія людзі і не здагадваюцца нават, што яны аплачваюць толькі траціну камунальных паслуг. Астатняе ж бярэ на сябе дзяржава. Я лічу, пра гэта трэба расказваць.

Горад Наваполацк народная абранніца ведае як свае пяць пальцаў. Тут пачынала сваю кар'еру яшчэ маладым спецыялістам. Нядзіўна, што і ў дэпутацкую прыёмную па першым часе прыходзілі хутчэй як на прыём да ўрача. Памяталі Іну Антонаву яшчэ па мінулай рабоце — у якасці галоўнага педыятра горада. І, між іншым, шмат якія, на першы погляд непераадольныя медыцынскія праблемы атрымалася вырашыць. Усё ж горад нафтахімікаў, і фактар шкоднасці, як ні круці, у наяўнасці.

— У навапалачанак быў высокі паказчык анказапушчанасці ў дачыненні да малочнай залозы, — згадвае Іна Антонава. — Мы правялі гарадскую акцыю «Здароўе жанчыны — здароўе нацыі». Запрасілі да сябе вядучых анколагаў, правялі агляды і навучанне супрацоўнікаў медустаноў. Вынікі ўразілі: за год трывожны паказчык знізіўся на 16 працэнтаў!

### Рашучасць

У характары дэпутата Антонавай гарманічна спалучаюцца жаночая чуласць і цвёрдая рашучасць. Абумоўленая, трэба думаць, прыродным імкненнем да дасканаласці.

— У мяне характар такі: я павінна ўсё зрабіць на 10 балаў, — адкрыта кажа народная абранніца.

Без гэтага, відаць, у жыцці маленькай Паліны Мішуты не было б такіх доўгачаканых пазітыўных змен. Дзяўчынка пакутавала ад рэдкага захворвання — сіндрому праклцяцця Ундзіны. Малая пераставала дыхаць, як толькі засынала... Яна не магла жыць па-за сценамі рэанімацыі без выратавальных для яе прыбораў. Дэпутат абабівала ўсе парогі, пакуль не выхадзіла з дапамогай дабрачыннага фонду «Шанц» аперацыю для дзяўчынкі ў Швецыі. Грошы збіралі ўсім горадам.

— Я сачыла за паступленнямі на дабрачынны рахунак. Давалі хто колькі мог — і студэнты, і пенсіянеры, сэрца сціскалася, калі бачыла, як людзі адгукаюцца на чужую бяду. І не веру я, калі кажуць, што людзі ў нас абыякавыя...

Кранула і дапамога адзінокім састарэлым. Пасля сумеснай акцыі з Наваполацкім аддзяленнем Беларускага Фонду Міра падарылі аддзяленню сястрынскага догляду ў гарадской бальніцы пральную машыну, шарсцяныя коўдры і цёплае адзенне, якое прынесла сама дэпутат — са сваіх уласных рэчаў. Але, бадай, самае галоўнае, што атрымалі пажылыя — цяпло не рэчаў, а душы.

### Прагрэсіўнасць і ініцыятыўнасць

Гатоўнасць да пераймання самых удалых і перадавых ідэй — каштоўная якасць на дзяржаўнай службе.

— Я заўжды напагатове, прыкмячаю ўсё новае, што бачу ў сталіцы ды іншых гарадах падчас сваіх паездак. І тое, што магчыма, адразу прапаную ажыццявіць у нас. Тыя ж веладарожкі — як, аказваецца, проста іх зрабіць пры адсутнасці вялікіх плошчаў. Няма ў нас магчымасці рабіць новыя дарожкі, давайце проста вылучым для іх асобную паласу. А то ўсё адмахваліся — грошай няма. Аказалася, можна і меншымі сродкамі абысціся. Варта толькі падумаць, як гэта зрабіць.

І тут важная праца ў камандзе:

— На планёрках у нашага мэра прысутнічаюць усе службы горада, дэпутаты розных узроўняў. Заўжды прыязджаю туды з прапановай. Ведаю, што ў людзей набалела. І мы разам думаем, як іх праблемы можна вырашыць. Цесна ўзаемадзейнічаем з дэпутатамі мясцовых Саветаў. Добры зачын дае група «Дыялог і партнёрства», арганізаваная мною, калі яшчэ была дэпутатам Віцебскага аблсавета. Мы шмат праблем абмяркоўваем і думаем, як разам можам іх вырашыць.

На сайце горада (novopolotsk.by) ёсць рубрыка «Трыбуна дэпутата». Для навапалачан гэта прамая магчымасць звязацца і з дэпутатамі мясцовых Саветаў, і з парламентарыямі абедзвюх палат.

— Мы расказваем там пра законы, якія прымаюцца, тлумачым, што яны дадуць людзям. Размяшчаем праекты дакументаў для абмеркавання. Дзелімся навінамі пра тое, што робіцца ў акрузе. У сайта шмат наведнікаў, яго з інтарэсам чытаюць.

«Трыбуна дэпутата» становіцца не толькі пляцоўкай для выступлення, гэта адначасова і віртуальная прыёмная: можна запытацца пра набалелае, не пакідаючы ўтульнага крэсла. У эфектыўнасці такой камунікацыі Антонава не сумняваецца.

— З'явілася адчуванне, што ў мяне не дзве рукі, а значна больш. Са столькімі людзьмі магу павітацца, пагутарыць і столькім магу дапамагчы.

Больш за ўсё прапаноў паступіла па праектах закона аб дзяржаўнай моладзевай палітыцы і кодэкса аб адукацыі. Прагрэсіўнасць народнай абранніцы не абмяжоўваецца высокімі тэхналогіямі. Яна адчувае, колькі дзвярэй дапаможа адчыніць валоданне замежнымі мовамі. Таму па вечарах самаўдасканальваецца ў лінгвістычным універсітэце — падцягвае англійскую.

— Трэба верыць у шчаслівы зыход любой справы, — не стамляецца нагадваць дэпутат.

Уласным пазітывам Антонава ахвотна дзеліцца з навакольнымі, і яго гаючы эфект відавочны: яе праца становіцца для многіх бальзамам для душы.

**Ала МАЧАЛАВА.**

# ЭКЗАМЕН ДЛЯ МЯСЦОВАЙ УЛАДЫ

**(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Менавіта Беладубраўскі сельскі Савет Касцюковіцкага раёна, а таксама Янаўскі сельскі Савет Краснапольскага раёна сёлета сталі «пілотнай пляцоўкай» па ўкараненні аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы (АІС) «Мясцовыя Саветы дэпутатаў». Плануецца, што ўжо ў наступным годзе такой «сістэмай» будуць ахопленыя ўсе мясцовыя Саветы дэпутатаў рэспублікі. Што гэта азначае на практыцы і якія перавагі дае? Па-першае, эканомію працоўнага часу работнікаў сельвыканкама: за некалькі хвілін яны могуць выдаць любую даведку, знайсці ў камп'ютары любую інфармацыю, якая датычыцца жыхароў сельсавета (ці варта гаварыць, што такім чынам эканоміцца і час наведнікаў?).

Па-другое, укараненне сістэмы зрабіла лёгкадаступнай прававую інфармацыю. Калі раней такая інфармацыя паступала ў сельскі Савет на кампактдысках, дык цяпер можна проста ўключыць камп'ютар, «зайсці» на адпаведны адрас і «ўзяць» неабходны прававы дакумент.

Па-трэцяе, у «інфакіёску» можна знайсці пералік абсалютна ўсіх адміністрацыйных працэдур (у дадатак да тых, якія выконвае непасрэдна сельвыканкам). Раней сакратару сельвыканкама неабходна было спачатку знайсці той ці іншы дакумент на паліцы, узяць яго ў рукі, адгарнуць пэўную старонку, а потым яшчэ (па просьбе наведніка) выпісаць інфармацыю на асобную паперку... Цяпер уся гэта працэдура займае лічаныя секунды.

У новую праграму закладзеныя ўсе звесткі, якія ёсць у пагаспадарчай кнізе (аб насельніцтве, аб зямельных участках, аб пасяўных плошчах, аб колькасці жывёлы і г.д.). Абнаўляюцца яны раз на год, 1 студзеня, па выніках падваравога абходу. Сёння не складае ніякай праблемы зрабіць любы стандартны адбор — за тыя ж лічаныя секунды скласці спісы льготнікаў ці пенсіянераў для патрэб упраўлення па працы і сацыяльнай абароне.

Паглядзеўшы, як функцыянуе аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма «Мясцовыя Саветы дэпутатаў», Анатоль Рубінаў заўважыў:

— Толькі ўдумайцеся, да чаго мы дайшлі — абмяркоўваем не нарыхтоўку кармоў, не выратаванне статка, як некалі, а ўкараненне камп'ютарнай сістэмы ў вёсцы. Адно гэта ўжо гаворыць само за сябе.

Падводзячы вынікі двухдзённай паездкі, Старшыня Савета Рэспублікі выказаў задаволенасць убачаным, і перш за ўсё — людзьмі, іх працавітасцю і жыццялюбствам.

— Узровень і якасць жыцця выходзяць сёння на першы план, становяцца асноўным крытэрыем пры выстаўленні адзнакі органам мясцовага кіравання і самакіравання, — падкрэсліў Анатоль Рубінаў. — Людзі ствараюць сем'і, будуюцца, нараджаюць дзяцей... І калі нехта спытае ў мяне: «Ці ёсць у Касцюковічаў і Краснаполля патэнцыял, ці будуць яны развівацца?», я адкажу з упэўненасцю: «Будуць». І чым далей, тым больш інтэнсіўна.

**Наталля КАРПЕНКА.**
*Мінск—Касцюковічы—Краснаполле.*

# КОЖНАМУ — СВАЁ

## Дарогі і вуліцы ў сельскіх населеных пунктах Гродзеншчыны перадаюцца на баланс дарожных арганізацый

**Такое рашэнне прыняў Гродзенскі аблвыканкам пасля абмеркавання гэтага пытання на нарадзе з удзелам старшыні абласнога выканаўчага камітэта Сямёна ШАПІРЫ, старшыні абласнога Савета дэпутатаў Андрэя НАУМОВІЧА, кіраўнікоў дарожных, жыллёва-камунальных і іншых зацікаўленых арганізацый і службаў.**

— Як вядома, нашы госці з замежжа даволі высока ацэньваюць дарожнае пакрыццё на беларускіх аўтатрасах. Што ж датычыцца дарог і вуліц у сельскіх населеных пунктах, то іх якасць патрабуе паляпшэння, — патлумачыў старшыня Гродзенскага аблсавета Андрэй Наумовіч. — А для гэтага ў кожнага аб'екта павінен быць гаспадар. На што і зрабіў акцэнт старшыня аблвыканкама, улічыўшы пажаданні раённых Саветаў дэпутатаў і звёнаў пярвічнага ўзроўню ўлады. Узважыўшы ўсе «за» і «супраць», мы прыйшлі да высновы, што дарогі і вуліцы ў сельскіх населеных пунктах павінны знаходзіцца на балансе дарожных рамонтна-будаўнічых упраўленняў. Гэта сёння, напэўна, найменш затратны механізм, паколькі арганізацыям жыллёва-камунальнай гаспадаркі спатрэбілася б набываць спецыялізаваную тэхніку. Ды і кожны павінен займацца сваёй справай. Мы ж не перадаём на баланс дарожнікаў сеткі водазабеспячэння, каналізацыі — менавіта спецыялісты ЖКГ там цяпер займаюцца навядзеннем парадку. А работнікі ДРБУ павінны прафесійна займацца паляпшэннем стану дарог і вуліц.

Праўда, ёсць адзін нюанс. Сёння дарогі і вуліцы ў шэрагу аграгарадкоў ужо знаходзяцца на балансе прадпрыемстваў жыллёва-камунальнай гаспадаркі. У сувязі з гэтым рашэннем аблвыканкама закладзена прававая норма, што кіраўнікі раённых упраўленняў ЖКГ будуць заключаць дагаворы з адпаведнай дарожнай службай на абслугоўванне гэтых дарог і вуліц.

Акрамя таго, у нестандартных, скажам так, сітуацыях (напрыклад, у зімовы перыяд, пры значным павелічэнні снежнага покрыва) раённым выканаўчым камітэтам даручана аказваць дарожнікам дапамогу з прыцягненнем сельскагаспадарчых і іншых арганізацый.

***— Дарожнікі, для якіх абслугоўванне дарог і вуліц у сельскай мясцовасці азначае дадатковую нагрузку, не ўспрынялі такое рашэнне «ў штыкі»?***

— Не, яны разумеюць, што дарогі і вуліцы — гэта іх напрамак дзейнасці. Што, дарэчы, цалкам адпавядае прэзідэнцкаму Указу № 21 у дачыненні да дарог і вуліц у сельскіх населеных пунктах.

***— А ці прадугледжваецца ў сувязі з гэтым умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы дарожных арганізацый?***

— Па просьбе дарожнікаў будзе прафінансавана ўстаноўка адпаведных знакаў дарожнай інфраструктуры ў сельскіх населеных пунктах. Паралельна, на працягу двух-трох гадоў, неабходна зрабіць пашпартызацыю дарог, тут таксама прадугледжваецца фінансаванне. Пэўная сума закладзена на наступны год і на матэрыяльна-тэхнічнае ўмацаванне ДРБУ. Зразумела, што адразу цалкам задаволіць запыты дарожнікаў немагчыма, адным крокам усё не робіцца, але гэтай праблеме ў вобласці будзе надавацца вялікая ўвага. Пры гэтым адзін з вызначальных фактараў — наша эканоміка. Калі яна працуе з ростам і ўсе прагнозныя паказчыкі выконваюцца, то, адпаведна, будуць павялічвацца і адлічэнні на ўтрыманне дарог і вуліц.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# ПАСЛЯ ВЯСЕЛЛЯ — У ВЫКАНКАМ

**Безумоўна, іншым рэгіёнам цяпер ёсць чаму павучыцца ва ўладаў Віцебска, якія ў апошні час шмат чаго робяць для таго, каб першыя гадзіны сумеснага жыцця новаспечаных мужа і жонкі былі насычаныя мноствам сюрпрызаў.**

У прыватнасці, дзе яшчэ ў Беларусі можна будзе літаральна пасля рэгістрацыі шлюбу заехаць у будынак аблвыканкама, каб падняцца на ліфце на вышыню птушынага палёту і паглядзець на горад з вежы? Па прапанове аблвыканкама будзе распрацаваны праект, у адпаведнасці з якім верхні ўзровень прыбудовы стане па-свойму ўнікальным месцам для вясельных здымкаў і пацалункаў. Дарэчы, менавіта ля будынка аблвыканкама стварылі вуліцу для вясельных картэжаў і пешаходаў (пра што паведамляе спецыяльны ўказальнік).

На мосце «закаханых» — так у народзе называюць Пушкінскі мост — па баках устанавілі чатырох бронзавых львоў, каб ахоўвалі шлюбныя саюзы. Пушкінскі мост вядомы тым, што менавіта на яго агароджы маладыя пасля наведвання ЗАГСа вешаюць сімвалічныя «замкі кахання», а ключы кідаюць у раку Віцьба.

У ЗАГСе і віцебскім рачным порце канстатуюць наплыў ахвотных адсвяткаваць вяселле на цеплаходзе «Віцебск». Да замаразкаў гэта цалкам магчыма. Нагадаю, новы ЗАГС пабудуюць у Віцебску якраз на беразе вялікай ракі побач са старажытным храмам.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Глушылі электратокам

**На возеры Нарач у аднайменным курортным пасёлку каля дома па вуліцы Зялёнай быў выяўлены факт здабычы рыбы з выкарыстаннем электратоку ад лініі электраперадач пасёлка.**

Парушэнне было выяўлена работнікамі Мядзельскай міжрайінспекцыі, упраўлення аператыўнага рэагавання Дзяржінспекцыі, супрацоўнікамі Мядзельскай РЭС (электрасетак) і аддзела аховы Нацыянальнага парку «Нарачанскі». Пры спробе адключэння правадоў ад ЛЭП затрыманы два беспрацоўныя мясцовыя жыхары 1976 года нараджэння. Са дна возера паднялі ізаляваны провад даўжынёй 280 метраў і агалены провад даўжынёй 76 метраў, а таксама восем асобін розных відаў рыб, у тым ліку аднаго вугра.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**по продаже права заключения договоров аренды нежилых помещений в жилых зданиях, принадлежащих РУП «Брестэнерго», для организации деятельности по оказанию бытовых услуг населению**

| № лота | Наименование помещений | Место-нахождение | Арендуемая площадь, кв.м | Срок аренды | Начальная цена: в базовых величинах | Начальная цена: в бел. руб.* | Задаток: в базовых величинах | Задаток: в бел. руб.* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Помещение в здании общежития | г. Брест, ул. Калинина, 40 | 87,7 | 3–5 лет | 21,925 | 767 375 | 2,1925 | 76 740 |
| 2 | Помещение в здании общежития с санузлом и лоджией | - " - | 43,0 | - " - | 10,750 | 376 250 | 1,0750 | 37 630 |
| 3 | Помещение в здании общежития | - " - | 21,9 | - " - | 5,475 | 191 625 | 0,5475 | 19 160 |
| 4 | Помещение в здании общежития | - " - | 19,1 | - " - | 4,775 | 167 125 | 0,4775 | 16 710 |
| 5 | Помещение в здании общежития | - " - | 10,6 | - " - | 2,650 | 92 750 | 0,2650 | 9 280 |
| 6 | Изолированное помещение в здании жилого дома** | г. Брест, ул. Вишневая, 32 | 14,4 | - " - | 3,600 | 126 000 | 0,3600 | 12 600 |

* – исходя из базовой величины в размере 35000 рублей, при изменении базовой величины изменяется соответственно сумма начальной цены и сумма задатка в белорусских рублях.
** – целевое использование помещения – для оказания услуг по ремонту обуви

| | |
|---|---|
| **Аукцион состоится -** | **9 декабря 2010 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Дзержинского, 58, каб. 405** |
| **Организатор аукциона -** | РУП «Брестэнерго», 224030, г. Брест, ул. Воровского, 13/1 |
| **Оплата задатка для участия -** | Перечислить не позднее 08.12.2010 задаток в размере 10 % от начальной цены лота на **р/с РУП «Брестэнерго» 3012000080019 в ОАО «БПС-Банк» филиал по Брестской области, г. Брест, МФО 309, УНП 200050653, ОКПО 00112006** |
| **Победитель аукциона -** | Участник, предложивший наивысшую цену с шагом аукциона 5 % |
| **Платежи, вносимые победителем -** | В течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона перечислить на расчетный счет РУП «Брестэнерго» сумму, по которой продан предмет аукциона, за вычетом внесенной суммы задатка, и сумму затрат на организацию и проведение аукциона |
| **Заключение договора аренды -** | В течение 5 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона при условии внесения победителем необходимых платежей |
| **Прием заявлений на участие в аукционе и прилагаемых документов -** | **С даты опубликования извещения по 08.12.2010 в рабочие дни с 14.30 до 16.00 по адресу: г. Брест, ул. Дзержинского, 58, каб. 215, тел. (0162) 27 13 44, 27 15 60** |

Для участия в аукционе необходимо:
- уплатить задаток на расчетный счет РУП «Брестэнерго» и представить копию платежного поручения о внесении задатка;
- подать заявление на участие в аукционе;
- заключить с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон.

К заявлению участники прилагают:

Юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа о государственной регистрации.

Юридическое лицо (нерезидент Республики Беларусь) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (произведенную не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Индивидуальный предприниматель – копию документа о государственной регистрации.

Физическое лицо – документ, удостоверяющий личность.

Представители юридических лиц, индивидуальных предпринимателей и физических лиц – доверенность и документ, удостоверяющий личность.

Порядок проведения аукциона, оформления участия и определения победителя установлен Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 8 августа 2009 г. № 1049.


# НЕ ВЫКІДВАЦЬ ТОЕ, ШТО ХОЧАЦЦА...



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

* * *

Шмат нараканняў у жыхароў сельсавета выклікае праца арганізацый раённых электрасетак (іх на тэрыторыі дзве — Заслаўскія РЭС і Астрашыцка-Гарадоцкія РЭС).

— Заслаўскія электрасеткі больш аператыўна і якасна выконваюць работы па замене лямпачак вулічнага асвятлення, чаго не магу сказаць пра Астрашыцка-Гарадоцкую арганізацыю, — адзначыў кіраўнік сельскага Савета. — Наш сельвыканкамам у канцы 2009 і пачатку 2010 года закупіў 150 новых, больш эканамічных, вулічных свяцільнікаў і яшчэ патраціў звыш 30 мільёнаў на іх устаноўку (з-за вялікай загружанасці РЭСаўскія арганізацыі былі не ў стане правесці гэтыя работы, прыйшлося звяртацца ў іншую спецыялізаваную структуру).

Наша газета раней пісала пра крытычную сітуацыю з электразабеспячэннем у вёсцы Сёмкаў Гарадок Папярнянскага сельсавета, дзе сеткі і апоры даўно маюць 100-працэнты знос і патрабуюць поўнай замены. Даведзеныя да адчаю людзі нават вымушаны былі звярнуцца са сваёй праблемай да старшыні Мінаблвыканкама.

— Сітуацыя там сапраўды складаная, — пацвердзіў старшыня сельскага Савета, — аднак з дапамогай грамадзян, якія звярнуліся ў аблвыканкам, мы зрушылі гэты воз з месца. За кошт інавацыйнага фонду «Мінскэнерга» выкананы праект замены апор, трансфарматарных падстанцый і ліній электраперадач у трох населеных пунктах — Сялюты, Чучаны і Сёмкаў Гарадок. Пасля ўмяшання губернатара, раённыя электрасеткі прыступілі да рэканструкцыі ліній электраперадач па гэтых населеных пунктах. На сёння праводзіцца ўстаноўка новых апор у Сёмкавым Гарадку, завезены апоры ў Чучаны.

Крызісная пакуль што застаецца сітуацыя з электразабеспячэннем у населеным пункце Дубаўляны. Для яго — зноў жа за сродкі інавацыйнага фонду «Мінскэнерга» — таксама выкананы праект па замене трансфарматарных падстанцый, ЛЭП і апор. Аднак да здачы новага ўчастка трасы Мінск—Мядзел адпаведныя работы правесці было немагчыма. Цяпер траса здадзеная, вядзецца добраўпарадкаванне цэнтральнай вуліцы Дубаўлянаў, ёсць магчымасць замяніць апоры і лініі электраперадач.

* * *

Водазабеспячэннем населеных пунктаў сельсавета займаецца ЖКГ. Усе мясцовыя свідравіны і водаправодныя сеткі знаходзяцца ў яе на балансе, за выключэннем двух населеных пунктаў, дзе аб'екты водазабеспячэння камунальная служба не прыняла па прычыне адсутнасці на іх адпаведнай дакументацыі.

— У гэтым канкрэтным выпадку застаецца спадзявацца, што на камунальную службу раёна будзе аказана адміністрацыйнае ўздзеянне — каб яна прыняла «па факце» свідравіны і водаправодныя сеткі ў вёсках Бараўцы і Ашмянцы, — патлумачыў Яўген Аляксандравіч.

Пакуль што не перададзены на баланс раённых камунальнікаў водаправод і свідравіны ў будучым аграгарадку Сёмкава, але ён пакуль што знаходзіцца ў стадыі будаўніцтва. Не выкананы работы па праграме «Чыстая вада» (у раёне былога ваеннага гарадка ў вёсцы Цнянка павінна з'явіцца новая свідравіна), але ёсць спадзяванні, што да канца года гэта будзе зроблена. Цэнтральны водаправод ёсць далёка не ва ўсіх населеных пунктах сельсавета, і там, дзе ён пракладзены, даўно наспела неабходнасць замены труб.

Цэнтралізаваны вываз смецця ў раёнах шматпавярховай забудовы сельсавета здзяйсняе камунальная служба, на астатняй тэрыторыі, дзе месцяцца прыватныя домаўладанні, — КУП «Кажухова».

— Вялікая наша бяда — нізкі ўзровень культуры насельніцтва, — адзначыў Яўген Савельеў. — Людзі дазваляюць сабе выкідаць тое, што захочацца, там, дзе захочацца. Напрыклад, на кантэйнерных пляцоўках, разлічаных для складзіравання цвёрдых бытавых адходаў, можна пабачыць і траву, скошаную на ўчастку, і бытавыя камунальныя адходы, і рэшткі будматэрыялаў, і шмат што яшчэ. Я прашу нашых людзей мець павагу да працы, якую выконвае КУП па зборы і ўтылізацыі адходаў. А калі людзям трэба вывезці нейкае негабарытнае смецце, то дастаткова скааперавацца разам некалькім суседзям, патэлефанаваць у выканкам, зрабіць заяўку. І КУПаўскі трактар вывезе адходы на звалку. Мы нават аплату браць не будзем — абы толькі грамадзяне не выкідвалі смецце там, дзе нельга гэтага рабіць.

* * *

У Папярнянскім сельсавеце працуюць 3 сельскія клубы, але іх недастаткова, лічыць Яўген Аляксандравіч.

— Жаданне ўсіх дэпутатаў нашага сельскага Савета — забяспечыць мясцовым жыхарам годны культурны адпачынак. Нам неабходны клуб, у якім можна было б правесці мерапрыемствы на ўзроўні ўсяго сельсавета. У нашых клубах ёсць толькі танцавальная зала і няма вялікага паўнавартаснага памяшкання для правядзення масавых урачыстасцяў. А яшчэ — вельмі мала спартыўных аб'ектаў. На тэрыторыі сельсавета ёсць выдатнае футбольнае поле, дзе праводзяцца раённыя і нават абласныя спаборніцтвы, але яно не мае ніякага афіцыйнага статусу і не адносіцца да аддзела спорту і турызму Мінрайвыканкама. Калі б раён узяў яго на свой баланс, мы б знайшлі спонсараў, якія дапамаглі б пабудаваць там паўнавартасную спартыўную залу. У аграгарадку «Бальшавік» няма ніводнай кавярні. А сталовая Першай Мінскай птушкафабрыкі не можа задаволіць усе патрэбы мясцовых жыхароў і ў першую чаргу абслугоўвае сваіх работнікаў ці загадзя заказаныя ўрачыстасці. Я запрашаю ўсіх зацікаўленых у будаўніцтве такога аб'екта да супрацоўніцтва, тым больш што ў Бальшавіку, дзе пражывае каля 3 тысяч чалавек і — з улікам наяўнасці добрых месцаў працы — высокі ўзровень жыцця, кавярня была б запатрабаваная.

**Інга МІНДАЛЁВА.**
*Мінскі раён.*


МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ — Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»
**Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.**
**Адказная за выпуск Наталля КАРПЕНКА.**
Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, дэпутат Смалявіцкага раённага Савета дэпутатаў Мінскай вобласці
**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 21 03;
**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**
**Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.**

# ЛЕПШЫ ЗАНЯТАК У ЖЫЦЦІ — БУДАВАЦЬ

**На пытанні журналістаў «Звязды» адказвае дырэктар ДКУАБП «Рассвет Поставский» Альфрэд МАЛЕЦ.**



Расцуць Паставы ўшыркі. Цесна новабудоўлям на Юбілейнай.

***— ДАВАЙЦЕ ПАЧНЁМ з вашай адметнасці — з аграрнага «цэха», што для будаўнічай арганізацыі досыць нязвыкла.***

— Мы сапраўды крыху спецыфічная фірма — у тым сэнсе, што сярод будаўнічых арганізацый вобласці адны маем буйны аграрны цэх. Аб'яднанне з калгасам «Рассвет» адбылося ў не лепшыя для яго часы з мэтай больш эфектыўнага выкарыстання патэнцыялу арганізацыі. Тады яшчэ не існавала такой развітой практыкі аб'яднання прамысловых і аграрных прадпрыемстваў, як зараз, і давялося доўга пераконваць мясцовыя ўлады, а затым самім распрацоўваць стратэгію і тактыку калектыўнай работы і ажыццяўляць яе на практыцы. Стан спраў у калгасе быў, мякка кажучы, не зайздросным, так што «выцягваць за вушы» давялося абодва калектывы.

З таго часу многае змянілася, засталася толькі назва «Рассвет Пастаўскі» і звычка не пасаваць перад цяжкасцямі, а вырашаць іх мэтанакіравана і паспяхова.

Калі ж гаварыць пра арганізацыю ў цэлым, то ёй зараз больш за 50 гадоў, і яна з'яўляецца дачэрнім камунальным унітарным аграрна-будаўнічым прадпрыемствам — генпадрадчыкам, што вядзе будаўніцтва шматпрофільнай наменклатуры як у горадзе, так і на вёсцы. Па сваім асноўным профілі выконваем фактычна ўсе віды работ — і агульнабудаўнічыя, і вузкаспецыялізаваныя. У нас вельмі моцны аддзелачны напрамак — моцныя брыгады тынкоўшчыкаў, маляроў, пліточнікаў. У прадпрыемства брыгадная структура, налічваецца 26 такіх міні-калектываў рознай спецыялізацыі, якія выконваюць, як мы кажам, максі-работу.

За апошні час асвоілі таксама сантэхнічныя работы, і ўжо самі выканалі сантэхніку ў 60-кватэрным доме, што зусім нядаўна было нерэальна. Абучылі людзей, закупілі абсталяванне, атрымалі ліцэнзію, і працуем. І так па пераважнай большасці відаў работ. Па той жа аддзелцы: столь — любая, абліцоўка — любая, праблем ніякіх няма. Ідзём гэтым шляхам далей, набылі за 50 мільёнаў абсталяванне для вырабу канструкцый з алюмінію і пачалі рабіць балконную агароджу. Самі яе і ўстанаўліваем.

У тых рэдкіх выпадках, калі не хапае ўласных сіл, запрашаем субпадрадныя арганізацыі, але гэта бывае не часта, бо стараемся асвоіць выдзеленыя заказчыкам сродкі самі. Такая звычка ідзе ад тых складаных часоў, калі калектыў у 400 «штыкоў» не меў у дастатку занятку для рабочых рук, і я думаю, што гэта не самая горшая традыцыя. Яна цалкам у духу рыначных рэаліў.

Майстрамі на ўсе рукі мы якраз і сталі менавіта ў апошнія, рыначныя гады, калі зрабілі развітой інфраструктуру работ, асвоілі новыя тэхналогіі і перападрыхтавалі кадры. І даволі ўпэўнена адчуваем сябе на будаўнічым рынку. Сёння не толькі забіраем усе аб'ёмы работ у сваім раёне, але і маем заказы ў суседніх — яшчэ і дзякуючы таму, што наша прадпрыемства самае буйное па аб'ёмах сярод аднатыпных сельскіх калектываў Віцебскай вобласці. Аказваем дапамогу Браслаўскаму, Шаркаўшчынскаму, Глыбоцкаму, Докшыцкаму і іншым раёнам.

***— Альфрэд Іосіфавіч, ці існуе статыстыка пабудаваных вашай арганізацыяй аб'ектаў?***

— Калі два гады таму адзначалі 50-годдзе, то была агучана такая лічба: усяго пабудавана ў розных кутках Пастаўшчыны больш за 1130 аб'ектаў, у тым ліку 720 дамоў агульнай плошчай 136 764 квадратныя метры. Узведзена 95 жывёлагадоўчых фермаў, 15 рамонтных майстэрняў, 13 школ, столькі ж клубаў, 4 жывёлагадоўчыя комплексы, 3 будынкі банкаў, паліклініка і шэраг іншых аб'ектаў. У апошні час уведзены Рэспубліканскі сацыяльны цэнтр у Лынтупах, і гэты аб'ект быў потым выстаўлены для ўдзелу ў прафесійным конкурсе, дзе атрымаў станоўчыя водгукі спецыялістаў і дыплом. Бралі ўдзел у рэканструкцыі роднага горада — у тым ліку палаца Тызенгаўза, набярэжнай, цэнтральнай раённай бальніцы, будынкаў аптэкі і млына, якія з'яўляюцца помнікамі архітэктуры. У Груздава — цэнтральнай сядзібе свайго аграрнага цэха — зрабілі рамонт у школе, 1 верасня ўручалі дзецям падарункі... У дзяржаўных праграмах будаўніцтва жылля на вёсцы мы ўдзельнічаем самым непасрэдным чынам.

Пачалі больш актыўна займацца будаўніцтвам шматкватэрнага жылля. Гэта, як вы разумееце, ужо само па сабе сведчыць пра ўзровень прафесійнай падрыхтаванасці калектыву, яго гатоўнасць узяць на сябе адказнасць перад забудоўшчыкамі. Бо тут ужо галоўнымі і даволі патрабавальнымі ацэншчыкамі якасці становяцца людзі, самі забудоўшчыкі.

***— А гэта праўда, што ў апошнія гады ў Паставах — сапраўдны будаўнічы бум?***

—Я б сказаў, што так і ёсць. Невыпадкова менавіта ўзвядзенне жылля займае больш за 50 працэнтаў у структуры аб'ёмаў работ, якія выконвае прадпрыемства. І колькасць уводзімых намі квадратных метраў штогод узрастае. Летась гэта былі восем тысяч «квадратаў», сёлета лічба ўзрасце. Дзякуючы падтрымцы дзяржавы людзі атрымалі ўнікальную магчымасць вырашыць сваю жыллёвую праблему. У нас на балансе — два свае інтэрнаты для моладзі і маласямейных. Іх насельнікі спачатку прыглядаліся, распытвалі, а зараз даволі актыўна будуюць уласныя кватэры.

## ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎЦУ

**Альфрэд Іосіфавіч — выпускнік Наваполацкага політэхнічнага інстытута, з «чырвоным дыпломам» закончыў будаўнічы факультэт. Ішоў першым па размеркаванні, а яно было ўсесаюзным. Але выбраў не Мінск ці Ленінград, хоць была магчымасць, а Паставы, пасаду майстра ПМК-33. Працоўная біяграфія складвалася цікава і, скажам так, разнастайна. Будаваў першыя вясковыя дамы на Віцебшчыне, два гады займаўся навукай у родным інстытуце, абараніў кандыдацкі мінімум. Вярнуўся намеснікам начальніка ПМК.**

**Пазней узначальваў камунальную гаспадарку раёна, выбіраўся дэпутатам райсавета. Калі калектыў ПМК застаўся без кіраўніка і апынуўся фактычна на мяжы развалу, узначаліў яго на самы гарачы перыяд. Потым была «камандзіроўка» ва ўладныя структуры, працаваў намеснікам старшыні райвыканкама па будаўніцтве. Закончыў Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Канчаткова ў родны калектыў вярнуўся праз паўтара года, бо тут зноў пачаліся праблемы. Магчыма, не ў іх уся справа — проста Альфрэд Іосіфавіч зразумеў, што яго месца тут. І лічыць: самы лепшы занятак у жыцці — будаваць.**



Як і наогул пастаўчане, ды і жыхары іншых раёнаў Віцебшчыны. Гэта стымулюе жыццёвую пазіцыю грамадзян, яны смела бяруць крэдыты і добрасумленна працуюць, каб вярнуць іх. Грамадства атрымала даволі моцны станоўчы імпульс.

Так што асноўнае для нас сёння — гэта шматкватэрныя жылыя дамы. Паколькі тэхналогія ўзвядзення жылля на вёсцы намі адпрацаваная да дробязяў, яно нас ніякім чынам не «напружвае». І шліфуем, даводзім да такога ж аўтаматызму тэхналогіі шматпавярховага будаўніцтва. Справа, безумоўна, перспектыўная, нават шматабяцальная, калі мець на ўвазе жыллёвую палітыку кіраўніцтва краіны. З гэтым накірункам звязваем свае перспектывы. Ставіцца задача давесці колькасны склад калектыву да 500 чалавек, бо работы шмат. Чакаецца, што ўжо ў наступным годзе аб'ёмы работ узрастуць у паўтара раза ў параўнанні з 2010-м. Сёння нават цяжка ўявіць сабе, як будзе выконвацца такая напружаная праграма. Праўда, калі б мне некалькі гадоў таму сказалі, што за год пабудуем у Паставах уласнымі сіламі тры 60-кватэрныя дамы, то я б аднёсся да гэтага з вялікім скепсісам.

***— А што сёння канкрэтна будуеце і дзе «прападае» з ранку да ночы дырэктар?***

— Разам з галоўным інжынерам Славамірам Кухальскім, намеснікамі дырэктара Уладзімірам Раманенкавым, Анатолем Гваздзёўскім, Уладзімірам Радчанкам і іншымі членамі нашага апаратнага «штаба» якраз на тых аб'ектах, пра якія мы гаварылі. У Паставах у рабоце тры шматкватэрныя дамы. Два дамы на 60 і адзін дом на 80 кватэр — вось яго якраз сёння пачынаем. У гарадскім пасёлку Варапаева ўзводзім 12-кватэрны дом, сельскае жыллё — у СВК «Курапольскі», «Хацілы» і «Камайскі». Вядзем будаўніцтва новай свінатаварнай фермы ў «Камайскім». У верасні закончылі новую сучасную ферму ў СВК «Хацілы», дзе даярак ужо замянілі робаты. Пачалі ў жніўні будаўніцтва ачышчальных збудаванняў малочнага завода. Працуем і на шэрагу іншых аб'ектаў. Магчыма, сярод іх няма эксклюзіўных, часцей за ўсё яны — звычайныя, але, калі можна так сказаць, «хлебныя», бо кормяць народ альбо даюць яму дах над галавой. І выконваючы іх адзін за адным, мы не ходзім па замкнёным коле. Наша работа хутчэй за ўсё нагадвае рух па спіралі, уверх — бо расце прафесіяналізм як «штабных» работнікаў, так і непасрэдных выканаўцаў. Скажам, мне, як і многім калегам-будаўнікам, зараз крыху сорамна за нашы дамкі для вяскоўцаў, якія мы ўзводзілі 10-15 гадоў таму, бо сродкі на іх выдзяляліся строга абмежаваныя, і не ўсе патрабаванні будучых жыхароў можна было ўзяць у разлік.

Магчыма, такім чынам мы знялі гарачку з жыллём на вёсцы, як некалі знакамітыя «хрушчоўкі» знялі яе ў гарадах. Але тым не менш. І агульнае наша шчасце, што краіна пакрысе станавілася багацейшай, і вельмі хутка праекціроўшчыкі маглі дазволіць сабе больш рэалістычны падыход да вясковых новабудоўляў, а з цягам часу нейкія фінансавыя абмежаванні былі знятыя цалкам. Так і зараз — ідзе далейшае пастаяннае ўдасканаленне праектаў, тэхналогій, і ў кожным наступным аб'екце дастаткова навацый. Так што і на вёсцы ўзводзім цалкам сучаснае, камфортнае жыллё, з нармальным гаспадарчым блокам.

І што яшчэ кардынальна памянялася — адносіны да масавага будаўніцтва на вёсцы з боку саміх гаспадарак. Яны ідуць на яго больш ахвотна. Бо пераканаліся, што патрэбны і новыя фермы, і машынныя двары, кватэры. На ўласным прыкладзе ведаю: калі б не пабудавалі ў нашым аграрным цэху 15 новых катэджаў, то з кадрамі было б вельмі складана. А так штат спецыялістаў укамплектаваны, кадравая праблема практычна закрытая, за выключэннем, магчыма, адной пазіцыі — мы прынялі б на работу некалькіх кваліфікаваных механізатараў. Заробкі тут нармальныя — і два мільёны, і больш, асабліва ў гарачы сезон.

***— Калі мы ўжо вярнуліся да вясковай тэмы, то скажыце некалькі слоў пра свой аграрны цэх.***

— Гэта знакамітае Груздава, радзіма вядомых груздаўскіх музыкаў, з лёгкай рукі якіх Паставы сталі цэнтрам штогадовага міжнароднага фестывалю «Звіняць цымбалы і гармонік». Сёння мы не толькі працягваем укладваць сродкі ў развіццё аграрнага філіяла, але і думаем пра перспектыву. Таму якраз учора адкрылі тут дзіцячы садок. Бо калі разлічваць на маладое папаўненне, то маладыя сем'і перш за ўсё цікавяцца кватэрамі і месцамі ў дзіцячых дашкольных установах. Жыллё будуем таксама.

Дапамагае аб'яднанне «Полацксельбуд», у склад якога мы ўваходзім. Я ўдзячны генеральнаму дырэктару Алегу Анатольевічу Кудзёлку і калегам — кіраўнікам упраўленняў, якія падтрымалі нас у нашых аграрных, скажам так, клопатах: кожнае прадпрыемства пералічвае нам на ўтрыманне адзінага ў сістэме трэста сельскагаспадарчага філіяла мільён рублёў штомесячна. Для нас гэтая падтрымка адчувальная і вельмі важная. У пэўным сэнсе дзякуючы і ёй мы набылі за апошні час тры сучасныя збожжаўборачныя камбайны, іншую тэхніку.

***— А якія планы па аграрным філіяле, Альфрэд Іосіфавіч?***

— У нас больш за тысячу галоў жывёлы, не хапае зямлі, каб яе карміць. Дзякуй, райвыканкам пайшоў насустрач, выдзеліў дадаткова 200 гектараў на суседніх землях. Прапануюць прыняць пад «крыло» яшчэ адну ферму. Відаць, і да гэтага прыйдзем. Бо зараз патрэбна ставіць жывёлу на зімовы перыяд, а 40 цялушак не ўмяшчаюцца. Бліжэй да вясны пагалоўе павялічыцца, наогул узнікне праблема з месцамі. Так што будзем нешта вырашаць з трэцяй фермай, бо патрэбна расці. На дзеючых фермах ідзём па шляху ўдасканальвання працэсаў — паставілі малакаправоды, механізавалі раздачу кармоў. Прыцэньваемся да даільнай залы з поўнай механізацыяй даення. Будуем іншым, і не мець у сябе — не зусім правільна.

***— Здаецца, яшчэ адна ваша спецыфічнасць тлумачыцца тым, што Пастаўскі раён — прыгранічны...***

— Мы выйгралі тэндар і ўдзельнічалі ў рэалізацыі дзяржаўнай праграмы ўладкавання мяжы. У маі мы здалі памежны пост «Ярэва», і ў мяне з'явілася вось гэтая афіцэрская фуражка як сімвал нашага даўняга супрацоўніцтва з памежнікамі. Мы для іх надзейныя партнёры. Акрамя Ярава, у нашым «актыве» — акруговы шпітальны комплекс. Некалі ў горадзе быў закінуты будынак вайсковага шпіталю, мы выканалі яго рэканструкцыю, зараз там лечыцца і мясцовае насельніцтва. Плюс Лынтупская пагранзастава — цалкам новая, і гэта быў наш першы аб'ект на дзяржаўнай мяжы з суседняй Літвой.

***— І ўсё ж за кошт чаго ў першую чаргу растуць аб'ёмы работ?***

— Некалькі гадоў таму перад калектывам была пастаўлена цалкам рэальная задача стаць першымі ў абласным аб'яднанні па аб'ёмах работ, а гэта асноўны паказчык у будаўніцтве. І мы ў выніку на працягу некалькіх гадоў займаем лідзіруючае месца ў трэсце. Тут некалькі прычын, некалькі складнікаў. Па-першае, кадры — як рабочыя, так і інжынерна-тэхнічныя. Штат ІТР укамплектаваны цалкам, але клапоцімся і пра дзень заўтрашні: за кошт прадпрыемства на вочным і завочным аддзяленнях ВНУ вучацца сем чалавек. Многія вучацца ў сярэдніх спецыяльных установах. Удалося зняць вастрыню праблемы і па кадрах рабочых спецыяльнасцяў — перш за ўсё з-за неблагой зарплаты. Нікому больш не трэба ехаць на заробкі ў Расію, каб пракарміць сям'ю.

Створаныя нармальныя бытавыя ўмовы на аб'ектах. Якраз учора на базе нашага прадпрыемства прайшоў савет дырэктараў трэста, і адным з пытанняў было наступнае — утрыманне ў належным парадку будаўнічых пляцовак і гарадкоў. У нас кожная брыгада мае сваю бытоўку, і калі ўчора ўдзельнікі савета заходзілі ў брыгадныя вагончыкі, то там — і абразок на «покуці», і карціна на сцяне вісіць, кругом чысціня. Некаторыя дырэктары так і сказалі: не ў кожнай хаце такі парадак.

***— Наколькі мы ведаем, у вас неблагі сацыяльны пакет.***

— Мы аднавілі выплату 13-й зарплаты. Да ўсіх святаў — Дня будаўніка, Дня маці, Новага года і гэтак далей фарміруем для членаў калектыву прадуктовыя наборы, бо здаём прадукцыю свайго філіяла на малочны завод і атрымліваем там масла, сыр, смятану і іншую прадукцыю пад знакамітым брэндам «Паставы гарадок». Дабаўляем каўбасы, мяса. Набор каштуе ад 50 да 100 тысяч рублёў. Кожны работнік на працягу года некалькі разоў атрымлівае такі падарунак. У нас свая свінаферма ў Паставах, і, калі ў чалавека падзея ў сям'і — напрыклад, вяселле ці юбілей, — ён можа выпісаць мяса ў лік будучай зарплаты.

З 1 кастрычніка пенсіянерам, якія адпрацавалі ў арганізацыі 25 гадоў і болей, даплачваем за кошт прадпрыемства да пенсіі паўтары базавыя велічыні — гэта сёння складае 52 тысячы 500 рублёў. А тым, хто ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, — 105 тысяч рублёў. Увага да сацыяльнага боку жыцця калектыву адзначана дыпломам Белсаўпрафа.

Ды і сам па сабе калектыў у нас дружны, працавіты. З сямейнымі дынастыямі, са сваімі традыцыямі, з моладзевай праслойкай. У арганізацыі зараз каля дваццаці працоўных дынастый — ніколі такога не было. А гэта нешта азначае, калі бацька прыводзіць сына, а сын — жонку. Значыць, іх тут многае задавальняе.

І добрыя людзі ў калектыве затрымліваюцца надоўга. Асаблівай цякучасці няма. Тым больш што пастаянна вядзецца абнаўленне тэхнікі і будаўнічых тэхналогій, ручной працы застаецца менш. Просты прыклад: пастаўка на аб'екты бетону і раствораў. Мы ўклалі сур'ёзныя сродкі, зрабілі бетонны вузел з сучаснымі дазатарамі, міксерамі і іншым абсталяваннем, набылі сродкі дастаўкі і — няма ніякіх праблем. І ўзялі перасоўны італьянскі бетонны вузел. Зараз іх два, што вельмі зручна пры рабоце ў аддаленых вёсках. Сродкі ўкладзеныя значныя, але яны даюць штодзённы прыбытак.





Прараб Ювеналій ДУНЕЦ і лепшая брыгада тынкоўшчыкаў-бетоншчыкаў на ўзвядзенні ачышчальных збудаванняў Пастаўскага малочнага завода.

Набылі сучасны траншэекапальнік на базе трактара МТЗ — і развязалі сабе рукі з укладкай труб, рыццём траншэй пад фундаменты: прайшла капалка, фразой прарэзала канаву ў грунце, і не патрэбны ні экскаватар, ні брыгада рабочых з лапатамі. І такіх прыкладаў шмат. З іх складваецца агульная карціна.

Такім чынам, за апошнія некалькі гадоў мы ўклалі ў развіццё немалыя сродкі, і за гэты тэрмін, як і за студзень — жнівень 2010 года, у нас лепшыя паказчыкі ў трэсце па інвестыцыях. Бяром банкаўскія крэдыты, выкарыстоўваем іншыя крыніцы, а таксама лізінг — менавіта для абнаўлення тэхнікі, тэхналогій і абсталявання. Дзякуючы таму, што маем свой буйны аграрны цэх, на нас распаўсюджваюцца прэферэнцыі і падтрымка, якія дзяржава аказвае сельгасвытворцам.

Дарэчы, тэхніку, якую ўзялі ў лізінг, стараемся выкарыстоўваць эфектыўна, каб не прастойвала: у гарачую сельскагаспадарчую кампанію яна працуе на палях, а як толькі сезон закончыўся — пераходзіць на нашы аб'екты, і будаўнічыя брыгады атрымліваюць масіраваную падтрымку.

Летась на інвеставанне пайшло тры з паловай мільярды рублёў. Мінулы год наогул складваўся для нас удала і завяршыўся занясеннем на абласную Дошку гонару. А за дзевяць месяцаў гэтага года ва ўласнае развіццё ўкладзена 1,7 мільярда рублёў. На канец года выйдзем прыкладна на 2,5 мільярда. Разумеем, што без гэтага няма руху наперад.

***— Тэмп росту прадукцыйнасці працы ў вас сапраўды вырас у паўтара раза...***

— Якраз за кошт новай тэхнікі, механізмаў. І — дакладнай арганізацыі працэсаў. А ўвогуле калі калектыў працуе гарманічна і адладжана, як адзіны арганізм, то любая работа спорыцца. Безумоўна: людзі павінны быць дакладна расстаўленыя, «азадачаныя», ведаць функцыянальныя абавязкі, і павінен быць кантроль. Паставіць усю гэтую работу на належны ўзровень дапамагла сістэма менеджменту якасці на аснове міжнародных стандартаў ISO — 9001. Адсюль і высокая прадукцыйнасць, і якасць працы.

Людзі трымаюцца за сваю работу, даражаць ёю, імкнуцца адпавядаць ёй. Адзінкавыя выпадкі, калі даводзіцца прымаць да некага жорсткія дысцыплінарныя меры. Я не магу сказаць, што мы дасягнулі нейкага ідэалу, у нас ёсць яшчэ рэзервы павышэння прадукцыйнасці працы, і мы іх бачым. Перш за ўсё — новыя тэхналогіі і матэрыялы. У гэтым сэнсе я хацеў бы ад імя будаўнікоў зрабіць адно ўдакладненне. Калі гавораць пра новыя будаўнічыя матэрыялы, то маюць на ўвазе таксама і сухія будаўнічыя сумесі. Мы разумеем прагрэсіўнасць сумесяў і гатовы працаваць імі, але вытворцам патрэбна нейкім чынам шукаць шляхі, каб зрабіць іх больш таннымі. Тады праекціроўшчыкі смела будуць закладваць іх у праект, а мы — смела карыстацца.

Тым больш што свае перспектывы звязваем з далейшым ростам аб'ёмаў работ. Будаўніцтва не дарэмна называюць лакаматывам эканомікі. Зараз для будаўнікоў створаны спрыяльныя ўмовы. Патрэбна максімальна іх выкарыстаць — для развіцця вытворчай базы, наогул шматбаковага развіцця калектыву. Для ўмацавання пазіцый на будаўнічым рынку, і не толькі айчынным. Шмат заказаў, толькі будуй. Але будуй якасна, на дзесяцігоддзі. Вось пра што мы зараз думаем і чым жывём.

**Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ, Вераніка АРЛОЎСКАЯ і Марыя ЖЫЛІНСКАЯ (фота).**

УНП 300456489.



ААТ «ААБ Беларусбанк»: новае жыццё старога будынка.



Прараб Эдуард ЛАПЦІК з тынкоўшчыцамі Фаінай ШЛЯГАЙ, Таццянай ЛАГАНАВАЙ, Жаннай ЛАСОЎСКАЙ, Алай ЦІТОВІЧ, Жаннай ПАЎЛОВІЧ і Вольгай ЯКІМОВІЧ.



Дзіцячы аздараўленчы цэнтр «Ветразь» адбудаваны на базе былога ваеннага гарадка.

## Перадавікі ДКУАБП «Рассвет Поставский»:

1. Брыгадзір брыгады муляраў Уладзімір АКЕЛАН.
2. Брыгадзір брыгады тынкоўшчыкаў Алена БУКАТАЯ.
3. Машыніст аўтапагрузчыка Чэслаў ЯНЕЛЬ.
4. Начальнік участка Віталь БРЫШЦЕН.
5. Цясляр Юрый ЗАРЭЦКІ.
6. Загадчык дапаможнай вытворчасці Віктар ГІМЖЭЎСКІ.
7. Машыніст экскаватара Міхаіл ЕРМАЛАЕЎ.
8. Токар Генадзь ТАТАРЧУК.
9. Сталяр Віктар ТРАХІМОВІЧ.
10. Вядучы інжынер-энергетык Валянцін ЯРКОЎСКІ.
11. Брыгадзір брыгады тынкоўшчыкаў Таццяна БЕЦЯНЬКОВА.
12. Галоўны інжынер Славамір КУХАЛЬСКІ.
13. Бетоншчык Леанід ШЫЦІК.
14. Машыніст аўтакрана Аляксандр АЛЕКСАНДРОВІЧ.
15. Выканаўца работ Аляксандр ДЗЯВЯТНІКАЎ.
16. Брыгадзір брыгады тынкоўшчыкаў Наталля КАМСЮК.
17. Намеснік дырэктара Уладзімір РАМАНЕНКАЎ.
18. Муляр Аляксандр МІХАЙЛАЎ.
19. Цясляр Мікалай КАМСЮК.
20. Машыніст бетоназмешвальніка Міхаіл КАРАЛЕНАК.
21. Бетоншчык Чэслаў МУКЕЛЬ.
22. Тынкоўшчыца Людміла ТАРАН.
23. Сталяр-станочнік Уладзімір ПЕТУХ.
24. Муляр Славамір КАЗЛОВІЧ.
25. Бетоншчык Святаслаў КРЫВЕНЬКІ.
26. Слесар-сантэхнік Іван ПУШНЯКОЎ.
27. Муляр Аляксандр МАРТАШЭНКА.
28. Бетоншчык Рыгор ДАЛЖАНОК.
29. Сталяр Уладзімір ЦІШАЛОВІЧ.
30. Токар Генадзь ЛАЎНІКОЎСКІ.
31. Муляр Раман НАЛЕЙ.
32. Тынкоўшчыца Ала ЦІТОВІЧ.
33. Машыніст экскаватара Павел ДЗІСЬКО.
34. Вадзіцель Міраслаў ЖАЛЕЙКА.
35. Муляр Анатоль ВОЛКАЎ.
36. Муляр Юрый ЯНУЧКОЎСКІ.
37. Выканаўца работ Эдуард ЛАПЦІК.
38. Сталяр Аляксандр КАПРАЛЮС.



Галоўны інжынер Славамір КУХАЛЬСКІ пазнаёміў нас з памежным пастом «Ярэва» і іншымі не менш прыгожымі новабудоўлямі.





Сучасная малочнатаварная ферма на 940 галоў у вёсцы Волахі. Жанчын у даільнай зале тут замянілі робаты.





На ўзвядзенні жылога дома для шматдзетнай сям'і Дзедаўцоў з вёскі Хацілы шчыруюць Кацярына СУДНІКОВІЧ і Анатоль БЕЛКІН.

# ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА*

**АЎТАРСКІ-12/14**

Майстар кампазіцыі Пётр Шклудаў (Наваполацк) працягвае свой конкурс эцюдам. У ім з дапамогай невялікай надстаўкі ён дабавіў гульню да папярэдняга задання:



**Белыя:** f2, дамкі b2, g3 (3). **Чорныя:** a5, c7, d6, f8, g5, дамка e1 (6). Выйгрыш: h4, e1 (b6A) g3 (dc5) h4 (f4) c1(ab4) h6(a3 B) f6 (e7) a5 (b2) c3, d2+. B(c3) f6 (d4) f4 (c5 C) h8 (g7) f6 (b4) h8 (a3) fe5, a1+. C(a5) h8 (e3) fb4+. A(ab4 DEF) h6 (c3) f6 (d4) hg5 (d6) e7 (e5) a3 (g7) d8 (f4 GHJK) c5, f8+. D(d4) h6 (g7) f8 (c3) f6 (d2) c3, a3+. E(cb4) h6 (a3) f6 (e7) b6, g7+. F(d6) h6 (e5) f4, a7(b4/e7 L) d4+. Варыянты G(e3), H(d2), J(h6), K(f6) і L(g7) застаюцца за вамі.

**ЛЁГКІЯ ПАРТЫІ**

Эпізоды з іх даслаў па электроннай пошце майстар ФМЖД Сяргей Бурко, якія атрымаліся ў яго паядынках са сваімі аршанскімі землякамі — кандыдатамі ў майстры спорту:

1. **Белыя** (Сяргей Бурко): c3, e3, f4, h4 (4). **Чорныя** (Канстанцін Патоцкі): a3, a5, a7, h6 (4). Ход чорных: 1. ...ab4? (неабходна 1...ab6 з раўнавагай) 2. c:a5 ab2 3. ed4 ba1 4. fe5 ab2 5. hg5!! h:d6 6. dc5 d:b4 7. a:a1 з апазіцыяй на карысць белых.



2. **Белыя** (Сяргей Бурко): a5, g1 (2). **Чорныя** (Мікалай Невар): h4, h6 (2). Чорныя пайшлі 1. ...hg3? 2. ab6 gf4 3. bc7 gf4 4. cd8 fe3 5. da5 і прайгралі. А трэба было 1. ...hg5!! з эцюднай нічыёй. Пераканайцеся ў гэтым у рамках **бліца-57/2.**

**УСЕ ВІДЫ КАМПАЗІЦЫІ**

Яны падуладныя грасмайстру СССР з Гомеля Леаніду Вітошкіну. Для бліца-56/3 ён прапануе камбінацыйную мініяцюру, якая завяршаецца двухварыянтным эндшпілем:



**Белыя:** 10, 11, 17, 23, 24 (5). **Чорныя**: 6, 8, 28, 32, 37, 42 (6).

А па-за конкурсам у яго малютцы пашукайце пераможны ўдар «пяткай»:

**Белыя:** 16, 32, 38, 39, 44 (5). **Чорныя:** 29, 31, 37, 41 (4).

* * *

***Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».***

**РАШЭННІ**

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў.

**«Пагода ў доме»-7** (М. Грушэўскі): **№ 22**. h6 (b4) I d2 (hc3AB) e1 (h4) c7=. B (a3) a5 (ab2) dc7=. A(d4, d4-b6) c7, e7=. I f4? (bc3!) g3 (b2) h4 A(g7) de7 (g5) a1 B(h8)x. IB h8 (a1)x. IA e1 (bc1!) a5 (f4)x і **№ 23.** I c7, b8, d6!, h6, h6, a7x. I b8? (a7 II) =. II (c1?) b6-c7!, d6 і далей, як у галоўным разгалінаванні.

**Аўтарскі-12** (П. Шклудаў): **№ 11.** b(fe7) f4 (g7) f2 (h6E) d4 (fg5) fe5 (f6) g7, e5 (g7) h8 (f4) d6 (b4FG) e7, a5x. E(c7) b6 (cd6) c7, e5x. F(g3) e7x. G(e7) f8 (g3) d4x і **№ 12**. B(ab6) g1 (a5) f2 (b6) g1 (dc5K) fe5, f8 (g5) f6, a7x. C(a5) g5, d8 (b4LM) a5 (a3) c5, c3x. K(bc5) b6, d4 (b6) a7 (f6) d4 (fg5) g1x. L(b6) f6 (b4) c5, a5x. M(c5) b6 (c5N) f6x. N(c7) a5x.

**Па-за конкурсам** (Ю. Мурадаў): 21 (19) 17 (21) 27 (21) 24 (30) 41, 37x.

**Бліц-56/2** (А. Шварцман — В. Варушыла): 1. ...1923 2. 4136? 23-29 3. 33:24 4-9 4. 15:13 8:30 5. 25:34 22-28 6. 32:23 18:49x.

---

Прэм'ера

# УСЕ ПАМЕРЛІ,

## але людзі лікавалі. Чаму?



Фота Міхаіла НЕСЦЕРАВА.

**Мужчыны, трымціце! Нават зашчэпка для валасоў у руках даведзенай да адчаю жанчыны можа ператварыцца ў зброю забойства. Прыклад: Флорыя Тоска такім чынам імкнулася абараніць сваю годнасць і ўратаваць каханага. Мастак Каварадосі трапіў за краты па палітычных прычынах — дапамагаў збегламу паўстанцу.**

Геніяльны кампазітар Джакома Пучыні ў оперы «Тоска» спалучыў закручаную інтрыгу, каханне, зайздрасць, прынцыпы, самаахвярнасць, смерць. Гісторыя гэтая можа ўспрымацца ў любой краіне ў любы час нават з-за сюжэтных калізій. Але ж тут яшчэ і музыка якая!.. Арыю Каварадосі, які пакутуе за кратамі, узгадваючы Тоску, напэўна, хоць раз у жыцці чуў кожны чалавек, а можа, і напяваў потым «хітовы» матыў, не ўсведамляючы, што гэта за прыгожая музыка. Сапраўды, бессмяротная — бо больш за 100 гадоў «Тоска» з'яўляецца адной з самых папулярных опер у свеце. Вялікі тэатр Беларусі звярнуўся да яе ў пяты раз.

Класічны твор у пастаноўцы Міхаіла Панджавідзэ, які ставіў гэты спектакль у якасці галоўнага рэжысёра тэатра, атрымаў класічнае прачытанне. Дух эпохі Напалеона імкнуўся аднавіць рэжысёр і мастак Аляксандр Касцючэнка. Напэўна, зыходзілі з таго, што Пучыні пісаў твор пра рэальныя падзеі часоў перамогі Напалеона пад Марэна. Адпаведна былі створаны касцюмы герояў, дэкарацыі на сцэне. Вядома, калі герой — мастак у Італіі, то як жа без фрэсак у храме?..

У цёмнай зале, дзе вірують гукі, магло стварыцца ўражанне, што сапраўды знаходзішся ў рымскім храме з распісанымі сценамі. Падман зроку? Не, новыя магчымасці тэатральнага абсталявання! Тое, што стала «візітоўкай» Міхаіла Панджавідзэ, што прывяло яго ў наш оперны тэатр, нашпігаваны розная тэхнікай пасля рамонту. Вось так патроху, дзякуючы галоўнаму рэжысёру, мы, можа, і зразумеем, навошта ўсе сучасныя «навароты» ў оперы, дзе галоўным заўсёды ўсё роўна будзе голас. Напрыклад, Уладзімір Громаў пераканаўча спяваў вераломнага Скарпіа, але зразумець, якія дэманы сядзяць у яго душы, дапамагла праекцыя выявы на калоны. Імгненне — і рамантычныя фрэскі ператвараюцца ў пачвараў, сімвалізуючы цёмную душу Скарпіа, сам ён — ці не ў вампіра, опера — у «жудзік» з акрываўленым героем, сцэнамі катавання.

Такія шыкоўныя трукі зацягваюць. Удалыя прыдумкі могуць дапамагчы зразумець, што арыі герояў — гэта іх боль, адчай, надзеі, усё, як у жыцці. Спецэфекты развярэдзілі пачуццёвасць гледача так, што і далей хацелася сцэнічных метамарфозаў, асабліва ў сцэнах, дзе перадаюцца глыбокія пачуцці. А ў «Тосцы» такіх сцэн шмат. Меркавалася, што калі рэжысёр стаў на шлях метафар, то ён будзе паслядоўны да канца. Аднак другая палова спектаклю была іншая — там дамінавалі дэкарацыі. Толькі я пачала спадзявацца на вынаходлівае рашэнне ключавых сцэн, як мне прапанавалі для агляду вялікія і груваcткія сходы. А пад лесвіцай на стале Тоска доўга мілавалася з Марыё... Стоп, — у іх насамрэч высокае каханне!.. Дзеля чаго былі патрэбныя сходы? Ну, напэўна, і не дзеля сцэны расстрэлу: расстрэльваць на прыступках, палячы знізу ўверх, неяк несур'ёзна нават для тэатра з яго ўмоўнасцямі. А, вось: дзеля таго, каб была вышыня, з якой можна было б потым кінуцца ўніз. Напэўна, вышыню не атрымалася «прадумаць» ці «спраецыраваць», ці зрабіць сімвалічнай (адкуль падае ў бездань чалавек, які губляе сэнс жыцця). Таму вышыню вырашылі проста пабудаваць. А ўжо хацелася калі не яшчэ якіх-небудзь сімвалічных дэманаў, то хоць бы амураў ці анёлаў (дзеля раўнавагі ўяўных сіл), якія апякаюць душы закаханых. Тым больш што нам ужо паказалі: яны неабавязкова могуць быць у натуральным выглядзе, а яшчэ ў арыгінальных праекцыях.

Я думала пра тое, што на спецэфекты гледача можна падсадзіць, калі ён будзе ад оперы чакаць найперш шоу. Вось жа і я купілася. Па сутнасці, нічога дрэннага ў гэтым няма, калі ўсё ўраўнаважваецца: драматургія, музыка, эфектныя рэжысёрскія знаходкі і выкананне партый (роляў) салістамі. За салістаў асабліва трывожна: найноўшая тэхніка і эксперыменты з ёй накладваюць на іх абавязак адпавядаць узроўню і не губляцца за «наваротамі», не проста спяваць, а іграць, ствараць вобраз. Бо нічога не вартыя ніякія сцэнічныя вынаходніцтвы ў оперы, калі няма чалавечага нерву, які перадае голас.

Такі трымаецца. Сведчанне гэтаму — авацыі, якімі публіка пасля прэм'еры ўзнагародзіла артыстаў. Заслужылі: на лябёдках уздымаліся, па сходах бегалі туды-сюды, нават сапраўднай вадой адлівалі беднага Каварадосі пасля катавання. А яшчэ і спяваць... Гледачы ацанілі. Прэм'ерныя спектаклі ішлі пры поўным аншлагу, квіткоў было не купіць, у касу стаяла чарга тых, хто спадзяваўся на нейкі цуд. Прэм'ера «Тоскі» — сведчанне цуду: у Беларусі ёсць глядач, які засумаваў па оперы! Які не шукае лёгкіх шляхоў і лёгкіх жанраў, гатовы слухаць оперу па-італьянску, задавольваючыся для разумення сэнсу бягучым радком з перакладам. Наш глядач хоча ўдасканальваць сябе. Гэта глядач, якога смела можна залічыць да інтэлектуальнай эліты краіны.

Для тых, хто таксама хоча элітай звацца: «Тоску» цяпер прыйдзецца чакаць доўга, але абяцаюць, што спектакль будзе ўдзельнічаць у першым оперным фестывалі. Каб даведацца, хто з герояў пры якіх абставінах загінуў, трэба ўсё ж ісці ў тэатр.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

---

Вакол навукі

# Канец часу настане яшчэ пры жыцці Сонца і Зямлі

**Фізікі з Японіі і ЗША падлічылі, што ў бліжэйшыя 3,7 мільярда гадоў час можа спыніць сваё цячэнне.**

Сваё даследаванне навукоўцы базіравалі на нядаўніх заявах амерыканскіх астраномаў, якія агучылі тэорыю пра бясконцае пашырэнне Сусвету. Вучоныя з цэнтра тэарэтычнай фізікі ўніверсітэта Каліфорніі ў Берклі вырашылі апратэставаць гэтую тэорыю. У сваім артыкуле яны заяўляюць, што Сусвет, які бясконца пашыраецца, не можа існаваць, паколькі законы фізікі не працуюць у бязмежным космасе. Для таго, каб гэтыя законы мелі хоць нейкі сэнс, Сусвет павінен быць канечным, і вучоныя вылічылі найбольш верагодную дату надыходу канца існавання Сусвету.

«Бясконцае пашырэнне Сусвету мае шэраг важных наступстваў. Любая падзея ў ім, якая мае ненулявую верагоднасць, здарыцца бясконцую колькасць разоў», — пішуць навукоўцы. Але калі існуе бясконцая колькасць кожнага магчымага назірання, то становіцца немагчымым вызначыць верагоднасць любой падзеі. Да такой сітуацыі законы фізікі прымяніць нельга. Паводле слоў фізікаў, адзіны выхад з гэтай галаваломкі — дапусціць якісьці тып катастрофы, якая пакладзе канец Сусвету. Тады ўсе верагоднасці зноў набудуць сэнс, а законы фізікі — сілу.

«Час наўрад ці прыйдзе да свайго канца ў нашу эпоху, але існуе 50-працэнтная верагоднасць, што час спыніцца ў наступныя 3,7 мільярда гадоў», — мяркуюць тэарэтыкі. Гэта азначае, што канец часу настане яшчэ пры жыцці Сонца і Зямлі. Разам з тым, вучоныя ўказваюць, што хоць невядома, які тып катастрофы прывядзе да канца часоў, чалавецтва не зможа гэтага ўбачыць. Прасцей кажучы, людзі «ўляцяць» у гэтую катастрофу так хутка, што не паспеюць заўважыць нейкага яе ўздзеяння.

# Магутную магнітную буру 2013 года перажывуць не ўсе

**У 2013 годзе адбудзецца небывалая па сіле магнітная бура. Менавіта на гэты час прыходзіцца пік актыўнасці Сонца ў цяперашнім 11-гадовым цыкле. Цэлая серыя гіганцкіх успышак можа моцна ўдарыць па здароўі жыхароў Зямлі, паведаміла ІТАР-ТАСС са спасылкай на The Daily Mail.**

Падобны аналіз зрабілі амерыканскія вучоныя падчас міжнароднай канферэнцыі, арганізаванай брытанскім Саветам па бяспецы электрычнай інфраструктуры. У сваю чаргу, газета The Sun робіць наступнае заключэнне: магутныя магнітныя буры прывядуць да таго, што жыццё на планеце будзе паралізаванае, а некаторыя людзі ўвогуле могуць іх не перажыць з-за сваёй метэаадчувальнасці. Выхад са строю электраабсталявання, які прагназуюць журналісты, можа прывесці да многіх смерцяў, бо тысячы хворых зараз падключаныя да апаратаў штучнага забеспячэння, пад рэальнай пагрозай акажацца жыццё пацыентаў з кардыястымулятарамі.

# Ідэальныя паводзіны катоў — толькі ва ўяўленні гаспадароў

**Амерыканскія заапсіхолагі паспрабавалі высветліць, чым займаюцца каты і кошкі падчас адсутнасці гаспадароў. Сярод саміх гаспадароў правялі апытанне наконт іх уяўлення пра баўленне вольнага часу чатырохногімі гадаванцамі. Большасць уладальнікаў катоў і кошак (71 працэнт) перакананая, што іх мурзікі-барсікі, калі застаюцца адны, мірна спяць. Але гэта не так.**

З дапамогай схаваных камер заапсіхолагі высветлілі, што большую частку часу каты і кошкі, прадастаўленыя самі сабе, глядзяць у акно (21,6 працэнта часу). Калі ў хаце ёсць іншыя жывёлы, то прыкладна 11,8 працэнта часу кошкі праводзяць з імі. Яшчэ 7 працэнтаў часу кошкі адводзяць для раздзірання мэблі, 6,1 працэнта — на разглядванне тэлевізара, часопісаў, паліц з кнігамі і дыскамі, амаль столькі ж — на драманне, 6,3 працэнта — на ляжанне пад сталом. Крыху менш (4 працэнты) часу ў кошак і катоў займае «медытацыя» перад ежай і непасрэдна яе паглынанне, 1,7 працэнта — знаходжанне ў ракавіне.

Засталося высветліць, ці задумваецца кошка, калі застаецца адна, чым займаецца яе гаспадар па-за межамі іх сумеснага жытла?..

**Падрыхтавала Інга МІНДАЛЁВА.**

---

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.15 | 16.30 | 9.15 |
| Віцебск — | 7.09 | 16.15 | 9.06 |
| Магілёў — | 7.05 | 16.20 | 9.15 |
| Гомель — | 6.57 | 16.21 | 9.24 |
| Гродна — | 7.30 | 16.46 | 9.16 |
| Брэст — | 7.26 | 16.51 | 9.25 |

**Месяц**

***Маладзік 6 лістапада. Месяц у сузор'і Шаляў.***

**Імяніны**

***Пр.*** *ІКОНЫ КАЗАНСКАЙ БОЖАЙ МАЦІ, Ганны, Лізаветы, Аляксандра, Антона.*

***К.*** *Яны, Альгерда, Віталя, Кароля.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




---

# ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

## по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

| Наименование предмета аукциона | Капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка | Незавершенное законсервированное капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка | Здание столярного цеха и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|---|---|
| Местонахождение недвижимого имущества | Брестская обл., Ивацевичский р-н, д. Нехачево | Брестская область, г. Иваново, ул. Карла Маркса, 117 | Брестская область, Лунинецкий район, г. Микашевичи, ул. Маяковского, 37 |
| Продавец недвижимого имущества | РСУП «Брестплемпредприятие», тел. (0162) 23 26 07 | ГУ «Брестская областная государственная инспекция по семеноводству, карантину и защите растений», тел. (0162) 45 22 75 | Республиканское унитарное производственное предприятие «Гранит» тел. (01647) 4 34 89, 4 34 51 |
| Сведения о предмете аукциона | Здание одноэтажное с холодной пристройкой, кирпичное, 1965 г.п., площадь – 38,8 кв. м. Земельный участок площадью 0,1091 га с ограничениями в использовании земель на площади 0,0042 га и 0,0398 га в охранных зонах линий электропередачи использовать для строительства производственных объектов, объектов общественного питания и торговли, объектов по оказанию услуг; срок аренды – 50 лет | Незавершенное строительством здание одноэтажное, кирпичное, площадь – 233,6 кв.м, готовность – 72 %, в т.ч. фундамент, стены и перегородки, перекрытие, кровля, полы – 100 %. Земельный участок площадью 0,0744 га использовать для размещения объектов по оказанию услуг, промышленности, общественного питания, торговли; срок аренды – 30 лет | Здание, 1-этажн., 1990 г.п., общая площадь – 99,0 кв.м. Земельный участок площадью 0,0255 га, срок аренды – 49 лет, ограничения в охранной зоне линии электропередачи напряжением свыше 1000 вольт на площади 0,0025 га, использовать земельный участок для размещения производства, общественного питания, торговли, услуг |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 5 157 368 | 70 100 235 | 5 773 180 |
| Сумма задатка, руб. | 515 000 | 7 000 000 | 577 318 |
| Организатор аукциона | *Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. (0162) 23 12 63, 20 87 85, 21 19 82, 23 44 06, 23 44 78, www.brest-region.by* | | |

Аукцион состоится **7 декабря 2010 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

**Для участия в аукционе представляются**:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 ГФ по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538; срок внесения суммы задатка – по 6 декабря 2010 г. включительно.

3. Юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования.

4. Иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

5. Иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

6. Представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан:

подписать протокол аукциона в день аукциона;

в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка; внести в местный бюджет плату за право заключения договора аренды земельного участка, после чего не позднее 2-х рабочих дней заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

***Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404, 413 фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00. и с 14.00 до 17.30 по рабочим дням по 6 декабря 2010 года включительно.***

---



Дарагі слуцак, паэт з Мінска **Яўген Гучок**! З 70-годдзем Вас! Шчасця, здароўя і новых здабыткаў!

**Маліноўскі.**

# АЛІМЕНТШЧЫКІ НА ЎЦЁКАХ

**Зараз каля васьмідзесяці чалавек знаходзяцца ў вышуку ў Віцебскай вобласці за няўплату аліментаў.**

Нядаўна адзін з такіх папаўся. Дарэчы, выпадкова: яго затрымалі аж но ў Расіі, дзе ён і спадзяваўся схавацца. Учыніў там злачынства, і яго затрымалі, а потым і высветлілася, што яшчэ ён і беларускі аліментшчык са стажам. Праваахоўныя органы Беларусі шукалі яго за няўплату аліментаў з верасня 2007 года. І па звестках на кастрычнік гэтага года, у выніку запазычыў па аліментах больш за 5,6 мільёна рублёў. Пасля таго, як ён адбудзе тэрмін пакарання ў Расіі, мужчыну дэпартуюць у нашу краіну для выплаты запазычанасці па аліментах і адбывання пакарання ў нас.

Дарэчы, Крымінальны Кодэкс за няўплату аліментаў прадугледжвае даволі жорсткае пакаранне неплацельшчыку: абмежаванне волі ад аднаго да чатырох гадоў або пазбаўленне волі на два гады.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# НЕ «ПАРАЗУМЕЎСЯ» З ІНФАКІЁСКАМ

33-гадовы рабочы аднаго з буйных прадпрыемстваў у Гомелі раскурочыў клавіятуру інфакіёска, які належыць ААТ «АСБ Беларусбанк». За начны «жарт» са складанай тэхнікай заведзена крымінальная справа, а страты, якія будуць спагнаныя з грамадзяніна, складаюць 2 мільёны рублёў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

---

## Дзве даты

## 4 лістапада



**1887 год** — нарадзіўся (г. Копыль) Цішка Гартны (Зміцер Фёдаравіч Жылуновіч), беларускі пісьменнік, дзяржаўны і грамадскі дзеяч. Акадэмік НАН Беларусі (1928). Пасля 1917 года — сакратар Беларускага нацыянальнага камісарыята пры ўрадзе РСФСР, рэдактар газеты «Дзянніца». Першы старшыня Часавага рэвалюцыйнага ўрада Савецкай Беларусі (студзень-люты 1919 г.). Узначальваў Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, быў намеснікам народнага камісара асветы БССР, рэдактарам газеты «Савецкая Беларусь», часопіса «Полымя». Выступаў як паэт, празаік, драматург, публіцыст, даследнік беларускай літаратуры і крытык. Аўтар раманаў «Сокі цаліны» і «Перагуды», п'ес, зборнікаў апавяданняў, артыкулаў па гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Беларусі. У 1923 годзе пленум ЦК КП (б) Б прыняў пастанову пра прысваенне Гартнаму звання народнага паэта Беларусі, але яно так і не было выканана. У 1931 годзе ён быў выключаны з партыі, а ў 1936-м — арыштаваны. У мінскай турме падвергся жорсткім катаванням, затым быў аб'яўлены псіхічна хворым. Пераведзены ў Магілёўскую псіхіятрычную бальніцу, дзе, па афіцыйнай версіі, у 1937 годзе памёр ад гангрэны лёгкіх, насамрэч скончыў самагубствам. Рэабілітаваны пасмяротна ў 1988 годзе. Яго імем названыя вуліцы ў Мінску, Капылі і іншых беларускіх гарадах.

**1848 год** — адкрыта першае ў свеце метро. Ідэю пабудаваць падземную чыгунку для хуткай транспарціроўкі гараджан з аднаго канца Лондана ў другі першым падаў адвакат Чарльз Пірсан. Першая лінія метро працягласцю ў 6 км звязвала лонданскія вакзалы Пэдынгтан і Фарынгдан і называлася Metropolitan Railway, што перакладаецца як «сталічная чыгунка». Скарачэнне гэтай назвы да пяці першых літар і дало ўсім нам знаёмае «метро».

## Цытата дня

***«Уменнем размаўляць выдзяляюцца людзі са свету жывёл; уменнем маўчаць выдзяляецца чалавек са свету людзей».***

**Рыгор Ландаў.**

# «КАБ НЕ ЧАПАЎ ЧУЖЫЯ ЛЫТКІ»...



**Нярэдка ў вясельных пажаданнях гучалі патрабаванні маральна-этычнага плана:**

*Дару мех пшаніцы,*
*Каб не чапаў чужых баб*
*за спадніцы.*

* * *

*Дару бычка,*
*Каб не шукала*
*іншага мужычка.*

* * *

*Дару шклянку суніц,*
*Каб не хадзіў*
*да чужых маладзіц.*

* * *

*Дару маладой каробку жукоў,*
*Каб не любіла чужых мужыкоў.*

* * *

*Дару мерку буракоў,*
*Каб не любіла чужых мужыкоў.*

* * *

*Дару жаніху ніткі,*
*Каб не чапаў чужыя лыткі.*

* * *

*Дарую мяшок жыта,*
*Каб жонка не была біта.*

* * *

*Дарую гаршчок капусты,*
*Каб не даваў жонцы распусты.*

* * *

*Дару галінкі бярозы,*
*Каб муж прыходзіў*
*дадому цвярозы!*

**Сярод усіх вясельных пажаданняў абавязковымі былі і пажаданні эратычнага характару:**

*Каб ваш ложак рыпаў, рыпаў,*
*А да году сынок выпаў.*

* * *

*Дару вам рубель,*
*Каб купілі карабель,*
*Каб дзень цалаваліся,*
*А ноч кахаліся.*

* * *

*Дарую дубовы пень,*
*Каб любіліся ноч і дзень.*

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

---

# Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 — № 40 (372)

## З вопыту агародніка

● Морква будзе захоўвацца лепш, калі перад закладкай апырскаць яе водным настоем шалупіння цыбулі.

● **Мацней і хутчэй загнівае агародніна (нават у пачатку захоўвання), якую моцна палівалі за 2—3 тыдні да ўборкі.**

● Сцёблы лубіну здрабніце і закапайце вакол кустоў парэчкі і агрэсту ў канаўкі 10х10 см, пасыпце попелам. Ураджай ад такой падкормкі ўзрасце ў 1,5 раза.

● **Вялікі ўплыў на лёжкасць агародніны аказвае тып глебы, на якой яе вырошчваюць. Лепш за ўсё захоўваецца гародніна, вырашчаная на лёгкіх і сярэдніх супясчаных, а таксама суглінiстых глебах. На забалочаных гліністых, сырых пойменных глебах, тарфяніках лёжкасць яе значна скарачаецца.**

## Вяленая аронія

Многія садаводы пакідаюць большую частку чарнаплоднай рабіны на кусце, не ведаючы, што з ёй рабіць. Птушкі, вядома ж, будуць удзячныя за такі пачастунак. Але існуе даступны метад нарыхтоўкі аронii, якім карысталіся нашы бабулі і які не патрабуе асаблівых намаганняў. На гарышчы рассцілаюць паперу, на якую тонкім слоем рассыпаюць ягады і пакідаюць на зіму. Да надыходу марозу аронія падвяльваецца і робіцца падобнай на разынкі. Мароз не пагаршае смаку, а наадварот: плады перастаюць быць даўкімі. Можна рассыпаць ягады чарнаплодкі ў доме на шафе — за 1—2 месяцы яны высахнуць, пасля чаго іх перасыпаюць у шкляныя слоікі для далейшага захоўвання. А з «разынкамі» можна і кампот варыць, і ў пірагі дадаваць.



## Шабельнік балотны

**Гэта цудоўная расліна, пра якую ходзяць легенды і пра якую не сціхаюць спрэчкі. У народзе шабельнік балотны яшчэ называюць дэкоп, пяцілiснік, лапчатка балотная, заечыя вушкі, рабіннік, серабрак, растапырнік, сустаўка.**

Гэта шматгадовы кустарнік з паўзучымі каранямі, чырвонымі адраўнелымі сцёбламі і цёмна-пурпуровымі кветкамі. У народнай медыцыне ён лічыўся папулярнай раслінай пры лячэнні многіх хвароб і ў першую чаргу для лячэння хвароб суставаў. Ламата цела, рук і ног, рэўматычны боль, боль ад надрыву пры падняцці цяжкіх прадметаў, радыкуліты, артрыты і поліартрыты — любы запаленчы боль у суставах будзе своечасова зняты і пры працяглым прымяненні адступіць калі не назаўсёды, то надоўга. Як сцвярджаюць траўнікі, для атрымання лячэбнага эфекту пры болях суставаў з дапамогай гэтай балотнай расліны прыём настойкі павінен быць даволі працяглым — 2-3 месяцы. Пры гэтым магчыма пагаршэнне стану здароўя на працягу 2 тыдняў (што называецца, абвастрэнне хваробы), але гэтага не трэба баяцца.

Для атрымання настойкі бяруць высушаны корань шабельніка, здрабняюць яго, засыпаюць у паўлітровы слоік да палавіны, затым заліваюць гарэлкай і ставяць у цёмнае месца на 21 дзень. Гатовую настойку ўжываюць па 1 чайнай лыжцы 3 разы на дзень да яды на працягу 8 тыдняў (з перапынкам 7 дзён пасля першага месяца лячэння). Каб зрабіць прымочку, трэба 2 сталовыя лыжкі травы абварыць кіпенем, загарнуць у марлю і гэтую гарачую падушачку прыкладваць да хворага месца. Такія ж падушачкі можна рабіць з адпрацаванай (настоянай) сыравіны, замест таго, каб яе выкідваць.

Мазь на аснове шабельніка балотнага сунімае боль у суставах. Яе раяць гатаваць так: насыпаць у шкляны слоік здробненую наземную частку шабельніка, заліць аліўкавым або сланечнікавым алеем і завязаць горла слоіка тканінай. Настойваць на сонцы на працягу месяца і затым працадзіць. Асобна растапіць свіны здор, нагрэць алей з выцяжкай шабельніка (тое, што ў вас атрымалася ў слоіку) да 70 градусаў і змяшаць. Для замацавання вынікаў пажадана праз паўгода прайсці паўторны курс лячэння. Калі шабельнік вам не дапамог, значыць, хутчэй за ўсё, была парушана тэхналогія прыгатавання настойкі альбо выкарыстоўвалася дрэнная сыравіна.

Для прыгатавання лекавых формаў можна выкарыстоўваць расліну цалкам ці браць толькі наземную частку. Але ўсё ж для лячэння суставаў лепш выкарыстоўваць толькі карані — як для прыёму ўнутр, так і для прымочак.

Вялікае значэнне мае выбар месца для нарыхтоўкі сыравіны. Лепш яго нарыхтоўваць на верхавых балотах. Дарэчы, сярод сыравіны, якую прадаюць на рынку, не ў крыўду будзе сказана для некаторых прадаўцоў, добрая сустракаецца рэдка. Сыравіну для лекаў трэба збіраць увосень, пачынаючы з верасня.

Шабельнік балотны паспяхова змагаецца з многімі хваробамі, абнаўляе ўсе аслабленыя клеткі арганізма, ачышчае яго ад шкодных рэчываў і не аказвае адмоўнага ўздзеяння на здаровыя органы. Прымяняецца пры гінекалагічных захворваннях, захворваннях печані і жоўцевага пузыра, ракавых пухлінах, радыкуліце, сухотах, сардэчна-сасудзістых захворваннях, адкладаннях соляў, язве страўніка, мастапатыі, поліартрыце, паралічах.

У шабельніка ёсць супрацьпаказанне — алергія. Як у любым выпадку лячэння народнымі сродкамі, варта параіцца з урачом.

---

## Усміхнемся!

— Скажыце, а як адрозніць чалавека ад мярзотніка?

— Выключна эксперыментальным шляхам. Вось, дайце мне 10000 рублёў...

— Не дам!

— Эксперымент скончаны.

☺

**Калі дзяўчына кажа табе: «Якое ў цябе прыгожае прозвішча...» — значыць, пара ўцякаць.**

☺

— Жонка, дай сто тысяч!

— Адкуль? Ты ж усяго сто тысяч мне з зарплаты аддаў!

— Дык гэта ж я на захаванне!




ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 5373. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# У БІЯГРАФІІ БРЭСТА — ГІСТОРЫЯ ТРЭСТА



Генеральны дырэктар ААТ «Будтрэст № 8» Міхаіл ВОДЧЫЦ перад момантам урачыстага адкрыцця Палаца водных відаў спорту і абласнога дыспансэра спартыўнай медыцыны.

**Напрыканцы мінулага тыдня ў Брэсце адбылася знамянальная падзея — урачыстае адкрыццё Палаца водных відаў спорту. На цырымоніі адкрыцця генеральны дырэктар ААТ «Будаўнічы трэст № 8» Міхаіл Водчыц уручыў сімвалічны ключ ад аб'екта Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Аляксандру Лукашэнку, а кіраўнік дзяржавы ў сваю чаргу перадаў сімвал юным спартсменам. Так пачалася біяграфія яшчэ аднаго брэсцкага спартыўнага палаца, узведзенага будаўнікамі трэста № 8. І з'явілася нагода пагаварыць пра буйнейшую арганізацыю будаўнічай індустрыі вобласці.**





Начальнік групы Вадзім ТАЛКАЧОЎ (на здымку справа), архітэктары Вольга РАБЦЭВІЧ, Анастасія СІДАРКОВА абмяркоўваюць праект новага жылога квартала Брэста.



## РАДКОМ ГІСТОРЫІ

*Крыху больш чым за паўстагоддзя будаўнікамі трэста ў горадзе і вобласці ўзведзена больш за 2300 аб'ектаў, у тым ліку: 112 школ, 93 дзіцячыя садкі, жылля агульнай плошчай больш за 1 мільён 750 тысяч квадратных метраў. Апошнім часам кожны год здаецца каля паўсотні аб'ектаў. Тыя самыя сімвалічныя ключы перадавалі ў свой час гаспадарам буйнейшых заводаў — «Газаапарата», электралямпавага, электрамеханічнага, бытавой хіміі, «Колератрона», аўтарамонтнага, «Брэстсельмаша», пінскага штучных скураў, кобрынскага інструментальнага. Гіганты лёгкай прамысловасці — дывановы і панчошны камбінаты ў Брэсце, а таксама мясакамбінат, хлебазавод, малочны камбінат у абласным цэнтры, цукровы і камбікормавы заводы ў Жабінцы, шэраг кансервавых заводаў па вобласці таксама на рахунку будтрэста № 8. А яшчэ практычна ўсе асноўныя аб'екты аховы здароўя: абласная бальніца, шматпрофільная гарадская, гарадская бальніца хуткай дапамогі, а таксама ўсе спецыялізаваныя бальніцы, радзільныя дамы ў Брэсце і Пінску, 13 раённых бальніц, 14 паліклінік, санаторыі і прафілакторыі. У спіс трэба ўключыць і самыя значныя ўстановы адукацыі, сярод якіх інжынерна-будаўнічы і педагагічны інстытуты (цяпер універсітэты).*

*Да гэтага часу будаўнікі трэста ганарацца асаблівым аб'ектам 70-х гадоў — мемарыяльным комплексам «Брэсцкая крэпасць-герой». Імі ж узведзены ўнікальны музей «Бярэсце», тэатр драмы і музыкі, кінатэатры горада, асноўныя спартыўныя збудаванні — стадыён «Спартак» (цяпер спарткомплекс «Брэсцкі», Лядовы палац, лёгкаатлетычны манеж, вяслярная база з інфраструктурай, палац «Вікторыя». А яшчэ прадпрыемствы гандлю і камунальнай гаспадаркі, памежныя пераходы «Варшаўскі мост», «Казловічы», «Макраны», «Дамачава». Хай даруе чытач за гэты пералік, але без яго складана ўявіць маштаб будаўнічай арганізацыі. Куды ні глянь у Брэсце, абавязкова вока ўпадзе на тое, што стварылі рукі нашых герояў. Вось і Дом друку, дзе размяшчаюцца большасць брэсцкіх газет і карпункты рэспубліканскіх выданняў і дзе пішуцца гэтыя радкі, таксама пабудавалі яны.*

## ВОДНЫ ПАЛАЦ — У СТРАІ



Намеснік галоўнага інжынера трэста № 8 Павел МІНЮК.

У будаўнічым трэсце ўсе яшчэ, можна сказаць, пад уражаннем ад завяршэння і здачы велізарнага аб'екта — Палаца водных відаў спорту. Гэта нават не палац, а комплекс аб'ектаў абласнога цэнтра алімпійскага рэзерву па водных відах спорту. У гэты комплекс уваходзіць і абласны дыспансэр спартыўнай медыцыны, якія злучаны з палацам галерэяй. У галоўным будынку новага палаца размешчаны асноўны басейн даўжынёй 50 метраў, шырынёй — 25. Калі ж спаборніцтвы будуць праводзіцца на дыстанцыі 25 м, то водную чашу можна разбіць на дзве часткі з дапамогай раздзяляльнай тумбы. Побач — яшчэ адзін басейн для скачкоў у ваду з вышкамі рознай велічыні, усяго ў палацы — чатыры басейны. Цяпер у Брэсце ёсць усе ўмовы для развіцця чатырох алімпійскіх відаў спорту: плавання, скачкоў у ваду, воднага пола і сінхроннага плавання, а таксама для правядзення спаборніцтваў любога ўзроўню. Новы палац разлічаны таксама на навучанне плаванню дашкольнікаў і трэніроўкі юных спартсменаў. Для спартсменаў створаны ўсе ўмовы: раздзявальні, пакоі адпачынку, саўны, спартыўныя і трэнажорныя залы. Усім гэтым арсеналам змогуць карыстацца і звычайныя гараджане для ўмацавання свайго здароўя.




Шматлікія ўзнагароды трэста № 8 за мінулыя дзесяцігоддзі сёлета дапоўніў дыплом міжнароднага савета СНД.

А пабудавала гэты велічны і прыгожы комплекс будаўнічае ўпраўленне № 83 трэста. З яго **начальнікам Мікалаем ЯРМАКОМ** мы сустрэліся за гадзіну-паўтары да ўрачыстага адкрыцця аб'екта. Літаральна кожныя тры хвіліны Мікалаю Іванавічу званілі падначаленыя, а таксама начальнікі, нешта ўдакладнялі, пыталіся, напаміналі. Такім чынам наносіліся апошнія штрыхі да пачатку прэзентацыі новабудоўлі. І першае пытанне, якое нарадзілася з самой атмасферы:

**— Ці даводзілася вам калі даваць інтэрв'ю ў такіх экстрэмальных умовах?**

— Усялякае бывала за 33 гады работы, — заўсміхаўся Мікалай Іванавіч. — Гэта нармальная рабочая абстаноўка перад хвалюючым момантам адкрыцця.

**— І колькі такіх момантаў было?**

— Як мінімум, 530. Менавіта столькі аб'ектаў узведзена за гэты час. Наша ўпраўленне будавала многія прамысловыя прадпрыемствы Брэста: машынабудаўнічае аб'яднанне, завод «Колератрон», мясакамбінат, мелькамбінат, піўвінкамбінат, а таксама транспартныя прадпрыемствы, усе водазаборы горада, ачышчальныя збудаванні, — прыкладна дваццаць аб'ектаў за год. З культурна-спартыўных устаноў найбольш запомніліся рэканструкцыя драматычнага тэатра ў 1995 годзе, спартыўны комплекс «Алімп» па вуліцы Дзяржынскага.



Такія жылыя будынкі будуе трэст № 8 у Брэсце: прыгожыя, трывалыя, утульныя.



Зімовы сад — навінка архітэктурнага ландшафту Брэста.



Галоўны архітэктар праектаў Валянцін ТАЛКАЧОЎ.

**— Колькі часу спатрэбілася на будаўніцтва вось гэтага цудоўнага воднага палаца?**

— Першыя пробныя палі забілі тут напрыканцы 2007 года, пачалі будаўніцтва дыспансэра спартыўнай медыцыны ў сакавіку 2008-га, а ў кастрычніку гэтага года прыступілі і да палаца. Дыспансэр мы здалі летась, ён ужо працуе. А палац здаём сёння. На ўсё спатрэбілася 30 месяцаў, а па праекце, гэта значыць, па нарматывах будаўніцтва, на такі аб'ект патрэбна амаль 60 месяцаў, дакладней — 59,5. Такім чынам, тэрміны будаўніцтва былі скарочаны амаль удвая.

**— Ці не адбілася такое скарачэнне тэрмінаў на якасці будаўніцтва?**

— Усе працаўнікі нашага калектыву разам з партнёрамі-праекціроўшчыкамі стараліся, каб гэтага не адбылося. Сёння ўжо можна сказаць, што тут мы мелі прыклад работы праектнай і падраднай арганізацыі, прыклад узаемаразумення і ўзаемнага даверу. Многае даводзілася ўдакладняць, карэктаваць, перарабляць па ходу. Як толькі ўзнікалі праблемы, нашы калегі з інстытута «Брэстпраект» і мы шукалі аптымальнае выйсце са становішча. Разам з імі мы прымянялі прынцыпова новыя падыходы да будаўніцтва. Напрыклад, забетаніравалі асноўныя ванны басейнаў, а потым сталі ўзводзіць дах. Такім чынам была дадзена магчымасць разам са знешнімі работамі весці ўнутраныя. Звычайна ж робіцца так: спачатку ўзводзіцца ўся знешняя абалонка, а затым унутраная «начынка». І заўважу, каб не сёлетнія катаклізмы прыроды — спёка, а потым моцныя ліўні, якія стварылі шмат дадатковых праблем, мы маглі б скончыць палац яшчэ раней.

**— Колькі ж людзей можа сёння святкаваць завяршэнне будаўніцтва такога значнага аб'екта?**

— Максімальная колькасць людзей, якія тут былі занятыя, — 600 чалавек. Значыць, усе яны, чыя праца ўкладзена ў гэту пабудову, заслугоўваюць падзякі. Асноўны спосаб занятасці — вахтавы метад з работай у суботу і нядзелю, у асабліва напружаныя дні работа была арганізавана ў тры змены, гэта азначае, будоўля ішла кругласутачна. Вядома ж, дзякуючы старанню, уменню, працавітасці нашых людзей стала магчыма сённяшняе, як вы заўважылі, свята. Нашы найлепшыя будаўнікі называюць сябе вучнямі Мінзера. Быў у нас раней брыгадзір, Мікалай Аляксандравіч Мінзер, які ўвасабляў у сабе ўсе лепшыя якасці будаўніка. Зараз ён на заслужаным адпачынку. Дык вось цяпер яго паслядоўнікі — брыгадзіры Васіль Будзько, Мікалай Забалоцец, Іван Турыч кіруюць маленькімі падраздзяленнямі вытворчасці — паказваюць прыклад рабочай доблесці.

**— Адзін аб'ект паспяхова здалі, да якіх новых прыступаеце?**

— Чаму прыступаем? Працуем паралельна на ўзвядзенні другой чаргі санаторыя «Белая вежа» ў Камянецкім раёне, узводзім жыллё, неўзабаве пачнём будаваць школу ў паўднёва-заходнім мікрараёне абласнога цэнтра. Работы хапае.



Вопытны спецыяліст — галоўны архітэктар зімовага саду Таццяна МАРОЗ — апекавала свой праект ад узнікнення ідэі да канца будаўніцтва аб'екта. Побач яе памочніца — малады архітэктар Ганна КАЛІНКІНА.

## МАЗГАВЫ ЦЭНТР ПЛЮС ТРАДЫЦЫІ

З **генеральным дырэктарам будаўнічага трэста № 8 Міхаілам ВОДЧЫЦАМ** нам таксама ўдалося перамовіцца толькі на прыступках Палаца водных відаў спорту перад яго здачай.

— На гэтай пляцоўцы, яшчэ раз акінуўшы вокам вынік работы нашага калектыву, зноў лаўлю сябе на думцы, што трэст і да сёння моцны традыцыямі, якія дзесяцігоддзямі стваралі папярэднікі, — пачынае размову Міхаіл Васільевіч. І ўсе восем гадоў, што я кірую арганізацыяй, маю шчасце так думаць. Нашы традыцыі і набыткі — гэта перш за ўсё тэхнічныя пытанні арганізацыі будаўніцтва, інжынерная падрыхтоўка і навучанне кадраў у цэлым, работа над дакументамі і цэлы шэраг самых розных, на першы погляд, нязначных момантаў, з якіх потым складаецца якасць работы і ўзровень аб'ектаў, якія ўзводзяцца.

**— А якія аб'екты за вашыя восем гадоў работы на пасадзе кіраўніка ўяўляюцца найбольш значнымі?**

— Для мяне яны значныя ўсе: і жылы дом, і дзіцячы садок, медыцынская ўстанова. Калі гаварыць пра значнасць для горада, вобласці, для грамадскасці ў цэлым, то гэта, вядома, такія гмахі, як, напрыклад, комплекс для гульнявых відаў спорту «Вікторыя». Я лічу, што Брэсту вельмі пашанцавала, калі ў горадзе з'явілася еўрапейскага ўзроўню вяслярная база. Гэта спрыяе не толькі якасці падрыхтоўкі нашых спартсменаў, але і міжнароднаму спартыўнаму аўтарытэту краіны. Спадзяюся, што вядомасць набудзе і сённяшні наш аб'ект. Важныя як для вобласці, так і краіны ў цэлым памежныя пераходы па зразумелых прычынах. З асаблівым стараннем мы паставіліся да будаўніцтва музея прыроды ў Белавежскай пушчы, там жа бываюць тысячы турыстаў. Вось і кажу, што ні зачапі, усё важнае.

**— Колькі людзей у вашым калектыве і якая яго структура?**

— Будаўнікамі трэста № 8 называе сябе больш за пяць тысяч чалавек. У структуры адкрытага акцыянернага таварыства — восем генпадрадных упраўленняў, аддзелачнае ўпраўленне, упраўленне механізацыі, упраўленне па дарожным будаўніцтве, завод ЖБК, упраўленне вытворча-тэхналагічнай камплектацыі, жыллёва-эксплуатацыйная кантора. Каб паспяхова кіраваць такім калектывам і ўзводзіць аб'екты ад самых малых да тых, што каштуюць150-200 мільярдаў рублёў, патрэбны добры мазгавы цэнтр арганізацыі. Думаю, што ён у нас менавіта такі.

Любая будоўля пачынаецца з аддзела падрыхтоўкі вытворчасці, які ўзначальвае намеснік галоўнага інжынера Павел Мінюк. Гэтая служба прымае дакументацыю ад заказчыка, потым штомесяц плануе работу для кожнага будаўнічага ўпраўлення і кантралюе ход работы з улікам уводу аб'ектаў, тэхналогіі будаўніцтва. Служба ж вядзе ўзгадненні з субпадрадчыкамі, іншымі ўдзельнікамі будаўніцтва. Названы аддзел таксама праводзіць закупкі матэрыяльных рэсурсаў, машын, механізмаў — усяго таго, што патрэбна на будоўлі.

У нас ёсць і свой аддзел комплекснага праектавання. Пад кіраўніцтвам галоўнага інжынера праектаў Алега Шапятухі нашы інжынеры і архітэктары распрацоўваюць цэлыя жылыя мікрараёны ў раёне вуліц Вароўскага — Веры Харужай у цэнтры Брэста, у мікрараёнах «Усход» і «Кавалёва». Акрамя жылля аддзел праектуе заводы ЖБВ, металічных труб, апошні замовіла адно з прадпрыемстваў свабоднай эканамічнай зоны «Брэст». Па ўласных праектах прадпрыемства ўзводзіць і аднакватэрныя жылыя дамы ў сельскай мясцовасці.

І так пра кожную службу, кожны аддзел можна расказваць доўга, бо ўсе яны працуюць на канчатковы вынік — на павышэнне эфектыўнасці будаўніцтва, на тое, каб будаваць хутка, добра, на сучасным тэхнічным і тэхналагічным узроўнях.

**— Каб расказаць пра ўсе падраздзяленні і службы пяцітысячнага калектыву і акрэсліць асноўныя моманты гісторыі трэста, відаць, спатрэбіцца цэлая кніга...**

— І яна ў нас ёсць. Тры гады таму да 50-годдзя будаўнічага трэста № 8 выйшла ў свет кніга пра нас усіх. Сапраўды, паўвекавая гісторыя арганізацыі стваралася працай некалькіх дзясяткаў тысяч будаўнікоў. Многія з іх адзначаны высокімі ўрадавымі ўзнагародамі, цэлы шэраг атрымалі званні заслужаных будаўнікоў краіны, нямала людзей сталі лаўрэатамі Дзяржаўных прэмій, былі ў розны час дэпутатамі Вярхоўных Саветаў СССР і БССР, зрабілі значны ўнёсак у развіццё будаўнічай навукі. У нас ёсць людзі-легенды, заслужаныя будаўнікі, якімі мы ганарымся. Такія, напрыклад, як былы кіраўнік нашай арганізацыі Уладзімір Іванавіч Газдзецкі, Герой Сацыялістычнай Працы Васіль Данілавіч Махновіч, якіх, на жаль, няма з намі.

Аўтар кнігі, адзін са старэйшых работнікаў трэста Іван Міхайлавіч Кусік сабраў і абагуліў унікальны матэрыял, які адлюстроўвае практычна ўсю гісторыю будаўнічай арганізацыі. Кніга каштоўная як для ветэранаў, сённяшніх працаўнікоў вытворчасці, так і для маладога пакалення, тых, хто прыходзіць. Хочацца, каб яны ведалі гісторыю, ганарыліся ёю.

Ну а справы кожнага дня, набыткі і поспехі працаўнікоў адлюстроўвае наша ўласнае выданне — штомесячная газета «Будаўнік».

**Матэрыялы старонкі падрыхтавалі Святлана ЯСКЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК, Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).**

УНП 200002603.



Скрыжаванне вуліц Гогаля і Савецкай у Брэсце ўпарадкавана згодна з распрацоўкамі трэста № 8.



Начальнік філіяла «БУ-83» Мікалай ЯРМАК.



Супрацоўнікі аддзела комплекснага праектавання: начальнікі групы канструктараў Раіса ФЕДАСЕЕНКА і Алена ГАЛАЎНЯ, інжынеры-канструктары Яўген МЕЛЕХ, Юлія СУЛАЎКА, Ігар СЛЕПЧАНКА, Сяргей КОЗЕЛ.



72-кватэрны жылы дом для работнікаў трэста будуецца ў Брэсце.



Брэсцкі палац спорту «Вікторыя».



Брэсцкая вяслярная база з вяслярным каналам.



Гандлёвы цэнтр «Карона» ў Брэсце.